
СТРАСЦЬ НА КОНЧЫКУ КІЯ
ЧЫРВОНКА

ЛЕТА, НАСЫЧАНАЕ... ПРАЦАЙ
ЧЫРВОНКА




Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

23 ЖНІЎНЯ 2018 г. ЧАЦВЕР № 161 (28777)


## ЦЫТАТА ДНЯ



**Леанід АНФІМАЎ, старшыня Камітэта дзяржаўнага кантролю:**

*«Значным дасягненнем работы сёлета за першае паўгоддзе я б назваў, як ні парадаксальна, істотнае зніжэнне колькасці праверачных мерапрыемстваў. Іх праведзена ў тры разы менш, чым у студзені — чэрвені мінулага года, колькасць скарацілася з 620 да 230. Нягледзячы на гэта, мы ўнеслі вялікі ўклад у папаўненне бюджэту краіны. У прыватнасці, намаганнямі КДК у дзяржаўную казну было вернута амаль 108,9 млн рублёў, папярэджаны неабгрунтаваныя выплаты дзяржсродкаў на суму 158,1 мільёна рублёў».*

## КОРАТКА

● **Больш за 30 % расходаў бюджэту на эканоміку Беларусі ў студзені — чэрвені 2018 года пайшло на падтрымку сельскай гаспадаркі.**

● Карпарацыйны фільм пра БелАЗ «Гонка кантынентаў» выйшаў у фінал міжнароднага фестывалю-конкурсу карпарацыйных і дакументальных тэлевізійных фільмаў у Канах. Яго зняла новасібірская кампанія LBL-Production да 70-годдзя БелАЗа.



● **Тураўскі малочны камбінат выпусціў у абарачэнне валютныя аблігацыі, тэрмін звароту якіх складае пяць гадоў. Намінал адной каштоўнай паперы — $ 1 тыс. Па аблігацыях будзе налічвацца даход у 6,5 % гадавых.**

● У Беларусі кожнае трэцяе дзіця перавозіцца з парушэннем правілаў.


ISSN 1990 - 763X


# «УЛЁТНЫЯ» КАНІКУЛЫ



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

**У жыхаркі Чачэрска Тамары ЛЕДЗЯНЁВАЙ пяцёра ўнукаў. На лета яны імкнуцца прыехаць да жыццярадаснай і гасціннай бабулі ў горад над Сожам. Вось і мінскі ўнук Макар ЛЕДЗЯНЁЎ, якому споўнілася чатыры з паловай гады, таксама летнімі дзянькамі становіцца чачэрцам, ведае ў горадзе шмат цікавых мясцін, напрыклад плошчу, дзе «прыпаркаваны» самы сапраўдны самалёт — стары ТУ-124.**

■ Скарбы роднай зямлі

## «Новая старонка бытавога жыцця сталіцы»

### Археолагі адшукалі ўнікальны набор металічных рэчаў

**Нядаўна сталічнымі археолагамі былі зроблены ўнікальныя знаходкі. Іх удалося адшукаць на вуліцы Вызвалення ў Мінску, дзе неўзабаве плануецца будаваць новыя, у тым ліку адміністрацыйныя, будынкі для праваслаўнай царквы. Знойдзеныя рэчы тым больш адметныя, што гэта не адзінкавыя цікавінкі, а цэлы комплекс — рознага памеру падковы, сякеры, кавалкі керамікі. Пра тое, што і як удалося адшукаць, карэспандэнту «Звязды» расказаў навуковы супрацоўнік Інстытута гісторыі Беларусі Сяргей ДЗЯРНОВІЧ, які непасрэдна пабачыў гэтыя рэчы.**



**«Выклікае цікавасць колькасць»**

«Тэрыторыя на вуліцы Вызвалення прылягае да гістарычнага цэнтра Мінска, адпаведна, патрабуе археалагічнага суправаджэння, — кажа суразмоўнік. — З гэтай прычыны археолагі Інстытута гісторыі апынуліся на аб'екце.

СТАР. 13

■ Сацыяльны праект

## НА ХВАЛЯХ ЗДАРОЎЯ

### У Віцебскай вобласці дзіцячы рэабілітацыйны цэнтр «Ветразь» удасканальваюць да міжнароднага ўзроўню

**Сёння, калі ў аздараўленча-рэабілітацыйным цэнтры «Ветразь» адпачывае тры сотні дзяцей і падлеткаў, складана ўявіць, што ўсяго некалькі гадоў таму ён быў не надта запатрабаваны. Запоўненыя жылыя карпусы, добраўпарадкаваная ўтульная тэрыторыя, а галоўнае — эфектыўныя рэабілітацыйныя праграмы для дзяцей з хранічнымі хваробамі і асаблівасцямі развіцця... Як «Ветразь» атрымаў новае жыццё, чаму на летні адпачынак сюды штогод едуць расійскія дзеці з прыватных школ і які вынік прыносіць комплексная рэабілітацыя — адказы на гэтыя пытанні карэспандэнт «Звязды» атрымала, пабываўшы ў Пастаўскім раёне.**



СТАР. 4

## Візіт Прэзідэнта ў Сочы

**Аляксандр Лукашэнка накіраваўся з візітам у Расію, паведамілі БелТА ў прэс-службе беларускага лідара.**

У праграме візіту значацца перагаворы з Прэзідэнтам Расіі Уладзімірам Пуціным, якія пройдуць у Сочы. На парадку дня — шырокі спектр пытанняў у развіцці беларуска-расійскага супрацоўніцтва, узаемадзеянне ў інтэграцыйных аб'яднаннях і на міжнародных пляцоўках, сусветны парадак дня.

Як паведамлялася, магчымасць сустрэчы ў Сочы лідараў дзвюх краін абмяркоўвалася 23 ліпеня ў час тэлефоннай размовы Аляксандра Лукашэнкі і Уладзіміра Пуціна. Тады кіраўнікі дзяржаў дамовіліся прадоўжыць сумесныя намаганні ў інтарэсах захавання пазітыўнай дынамікі ўзаемадзеяння.

■ Жніво-2018

# 100 ТЫСЯЧ ТОН ЗБОЖЖА

### ...для агульнага каравая. Такі ўнёсак зрабілі шклоўскія хлебаробы

**Яны пакуль адзіныя ў вобласці, хто змог сабраць такі важкі ўраджай. Перадавікоў жніва ўшанoўвалі на полі фермерскай гаспадаркі «Новы быт» у вёсцы Новыя Комсінічы Шклоўскага раёна. Пра яе гаспадара Аляксандра Канавалава, які працягнуў справу свайго бацькі і паспяхова займаецца сельскай гаспадаркай, «Звязда» ўжо аднойчы пісала. Гэта добры прыклад таго, як можна плённа працаваць на карысць сваёй малой радзімы. І што асабліва каштоўна — не адзіны на Шклоўшчыне.**



Фота БелТА.

— Мне вельмі прыемна прысутнічаць на такой знакавай падзеі, — адзначыў падчас ушанавання шклоўскіх хлебаробаў **старшыня Магілёўскага аблвыканкама Уладзімір ДАМАНЕЎСКІ.** — Уборачная збожжавых у вобласці падыходзіць да завяршэння: засталося ўбраць каля 6 % пасяўных плошчаў. Прыемна тое, што ў вельмі няпростых умовах надвор'я, якія характарызуюцца недаборам ураджаю збожжавых і зернебабовых культур, кадры Шклоўскага раёна ў чарговы раз пацвердзілі свой прафесіяналізм — мужнасць і імкненне паказаць, як трэба працаваць на зямлі.

Разам са словамі падзякі за такі значны аб'ём намалоту — 100 тысяч тон — губернатар уручыў старшыні Шклоўскага райвыканкама Васілю Віцюнову падзяку аблвыканкама. Граматы і сімвалічныя караваі атрымалі таксама найлепшыя кіраўнікі сельгасарганізацый, механізатары, кіроўцы, фермеры.

На раніцу 22 жніўня на Магілёўшчыне было ўбрана ўжо 95 % плошчаў збожжавых і зернебабовых, валавы намалот склаў 735,5 тысячы тон збожжа пры сярэдняй ураджайнасці 26,3 цэнтнера з гектара. Па ўраджайнасці лідзіруе Шклоўскі раён — 43 цэнтнеры з гектара, другое і трэцяе месцы ў горацкіх (34 ц/га) і магілёўскіх (31,1 ц/га) хлебаробаў адпаведна.

**Нэлі ЗІГУЛЯ**

## Прамыя тэлефонныя лініі — 25 жніўня

**Традыцыйныя адкрытыя кантакты жыхароў краіны з кіраўнікамі абласцей адбудуцца з 9.00 да 12.00. У іх прымуць удзел:**

намеснік старшыні БРЭСЦКАГА аблвыканкама Вадзім Іванавіч АЛЬШЭЎСКІ. Тэл. 8 016 221 31 21;

кіраўнік спраў ВІЦЕБСКАГА аблвыканкама Аляксандр Уладзіміравіч СЫСОЕЎ. Тэл. 8 021 222 22 22;

кіраўнік спраў ГОМЕЛЬСКАГА аблвыканкама Алена Уладзіміраўна КЛІЧКОЎСКАЯ. Тэл. 8 023 233 12 37,

намеснік старшыні ГРОДЗЕНСКАГА аблвыканкама Уладзімір Іосіфавіч ДЗЯШКО. Тэл. 8 015 273 56 44;

кіраўнік спраў МАГІЛЁЎСКАГА аблвыканкама Рыгор Аляксандравіч ВАРОНІН. Тэл. 8 022 250 18 69;

намеснік старшыні МІНСКАГА аблвыканкама Сяргей Пятровіч НЕЎМЯРЖЫЦКІ. Тэл. 8 017 500 41 60;

старшыня МІНСКАГА гарвыканкама Андрэй Віктаравіч ШОРАЦ. Тэл. 8 017 222 44 44.

■ Візітоўка раёна

# У БРЫЧЦЫ НА ГАННЕНСКІ ФЭСТ

## Знакаміты конны кірмаш стаў сапраўдным брэндам Зэльвы

**Старажытны Ганненскі фэст праводзіцца вось ужо сем гадоў запар, хоць яго адраджэнне пачалося задоўга да гэтага. Сёлета кірмаш пройдзе разам са святкаваннем 760-годдзя заснавання пасёлка. Што чакаць ад брэндавага фэсту ў новым фармаце, мы пацікавіліся ў старшыні Зэльвенскага райвыканкама Дзяніса АЛЬШЭЎСКАГА.**



***— З гісторыі мы ведаем, што заснавальнікамі кірмашу сталі былыя ўладальнікі Зэльвы з роду Сапегаў, якія атрымалі дазвол на правядзенне свята ў XVIII стагоддзі. Тады кірмаш працягваўся цэлы месяц і быў адным з самых вядомых у Еўропе. Асабліва ён славіўся гандлем коньмі. Што захавалася з тых часоў і перайшло ў сённяшні дзень?***

— Арганізатары свята пастараліся захаваць гэтую асаблівасць. Таму і сёлета госці свята змогуць не толькі ўбачыць коней, але і пакатацца на іх вярхом альбо ў брычках і павозках на працягу ўсяго дня па вуліцах Зэльвы. Створана адмысловая пляцоўка. Тут нават пройдзе конкурс на самую лепшую павозку і ўпрыгажэнне коней. Рыцары таксама сядуць на коней, каб паспаборнічаць у турніры.

Дарэчы, розных пляцовак будзе працаваць з дзясятак. На іх можна будзе паглядзець выстаўкі, паўдзельнічаць у майстар-класах рамеснікаў, нешта купіць, паглядзець тэатральныя пастаноўкі, рыцарскія баі і многае іншае. Лічу, не менш цікавымі будуць фестывальежы і прэзентацыя нацыянальных падворкаў. У гэты дзень мы таксама ўшануем і нашых перадавікоў жніва: у праграму свята ўключылі раённыя «Дажынкі».



Фірменая паштоўка.

***— Дзяніс Аляксандравіч, я заўважыла, што свята пачнецца не ў суботу, а на некалькі дзён раней. З чым гэта звязана і што ў гэтыя дні плануецца цікавага?***

— Сапраўды, праграма не абмяжоўваецца выхаднымі, бо мы сумясцілі дзве важныя падзеі — Ганненскі кірмаш, які адбудзецца ў суботу, 25 жніўня, і 760-годдзе заснавання Зэльвы. Да гэтай даты ў чацвер у раённай бібліятэцы пройдзе навуковая канферэнцыя, прысвечаная гістарычнай спадчыне райцэнтра. Вялікая праграма рыхтуецца і ў пятніцу. Мы задзейнічалі ў ёй нават наша вадасховішча — там пройдуць раённае і абласное спаборніцтвы па рыбнай лоўлі. А на стадыёне — міжнародная футбольная сустрэча з камандай з Польшчы.

У цэнтральным скверы і на плошчы можна будзе ўбачыць фотагалерэю знакамітых ураджэнцаў Зэльвеншчыны, таленавітых майстроў-аматараў, прынязць удзел у паэтычных сустрэчах, конкурсах вершаў і песень. У гонар юбілейнай даты адбудзецца цырымонія ўзнагароджвання найлепшых работнікаў раёна.

***— Думаю, многія, хто збіраецца наведаць свята, хацелі б даведацца аб відовішчах, якія падрыхтавалі арганізатары, каго з «зорак» запрасілі выступіць падчас юбілею пасёлка і Ганненскага фэсту?***

— Відовішчаў будзе дастаткова. Упершыню ў свяце прымуць удзел вулічныя тэатры. Акрабаты, жанглёры, жывыя статуі — 60 вулічных артыстаў з усёй Беларусі ператорыць вуліцы Зэльвы ў яркую п'есу. Можна будзе перанесціся ў Балівуд, на планету скарбаў запросіць тэатр «Галактыка». Адбудуцца майстар-класы па народных гульнях і танцах.

Меламаны змогуць паслухаць як аматарскія творчыя калектывы, так і вядомых эстрадных выканаўцаў. У Зэльве выступяць ансамбль «Бацька Атаман», арт-гурт «Беларусы», артысты з Польшчы і Латвіі. Уражальным абяцае быць шоу тэатра танца з Брэста «Фантазія» і тэатра агню. Напрыканцы будуць відовішчны салют і лазерна-танцавальнае шоу. Думаю, усе, хто захоча правесці свой уік-энд у Зэльве, не пашкадуюць аб гэтым. І нават змогуць адправіць адсюль паштоўку ў фірменным канверце з лагатыпам брэндавага свята Зэльвеншчыны, у цэнтры якога быў і застаецца прыгажун-конь.

**Маргарыта УШКЕВІЧ**

# ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

### У АПЕРАЦЫІ Ў СІРЫІ ЎДЗЕЛЬНІЧАЛА ЗВЫШ 63 ТЫСЯЧ РАСІЙСКІХ ВАЙСКОЎЦАЎ

Расійскія вайскоўцы ўдарамі авіяцыі і крылатых ракет знішчылі ў Сірыі больш за 86 тысяч баевікоў, у тым ліку 4,5 тысячы выхадцаў з Расіі і краін СНД. Такія даныя прыводзяцца ў відэаролiку, апублікаваным на афіцыйным канале Мінабароны Расійскай Федэрацыі ў YouTube. У міністэрстве таксама паведамілі, што звыш 63 тысяч расійскіх вайскоўцаў, у тым ліку 26 тысяч афіцэраў і 434 генералы, атрымалі баявы вопыт у Сірыі. Як вядома, аперацыя паветрана-касмічных сіл РФ у гэтай краіне пачалася 30 верасня 2015 года. 11 снежня мінулага года прэзідэнт Расіі Уладзімір Пуцін заявіў аб яе завяршэнні і аддаў загад аб скарачэнні расійскай групоўкі войскаў у рэспубліцы.

### НОВЫ КІРАЎНІК УРАДА ПАКІСТАНА ЗАКЛІКАЎ ІНДЫЮ «ВЫРАШЫЦЬ УСЕ СПРЭЧНЫЯ ПЫТАННІ»



Прэм'ер-міністр Пакістана Імран Хан заклікаў кіраўніцтва Індыі пераадолець існуючыя супярэчнасці, уключаючы кашмірскае пытанне, шляхам дыялогу, перадае ТАСС. «Найлепшы спосаб перамагчы беднасць і павысіць узровень жыцця насельніцтва на субкантыненце — вырашыць нашы праблемы і перайсці да дыялогу», — заявіў Імран Хан. Тэрыторыя княства Кашмір застаецца прадметам спрэчкі паміж Індыяй і Пакістанам з 1947 года, калі Брытанская Індыя, атрымаўшы незалежнасць, падзялілася на дзве дзяржавы па рэлігійнай прыкмеце. З-за Кашміра адбыліся дзве з трох інда-пакістанскіх войнаў. Цяпер у Кашміры няма дзяржаўнай мяжы: яго тэрыторыю падзяляе «лінія кантролю». У індыйскай часткі актыўна дзейнічаюць групоўкі, якія выступаюць за аддзяленне ад краіны, Нью-Дэлі пастаянна абвінавачвае Ісламабад у падтрымцы тэрарыстаў, Пакістан абвяргае гэтыя абвінавачванні.

### УКРАІНСКІ ПРЭМ'ЕР НАЗВАЎ ПАМЕР ДЗЯРЖДОЎГУ КАТАСТРАФІЧНЫМ



Прэм'ер-міністр Украіны Уладзімір Гройсман прызнаў, што цяперашняя сума дзярждоўгу пагражае бюджэту краіны катастрофай. Прадстаўляючы стратэгію кіравання дзяржадоўгам на пасяджэнні ўрада, Гройсман рэзка раскрытыкаваў дзеянні папярэдняй украінскай улады, якая значна нарасціла даўгі дзяржавы. «З 2005 да 2013 года ў краіне не было сістэмных зменаў», — зазначыў ён, задаўшыся пытаннем, куды ж падзеліся тыя пазычаныя $50 млрд. Прэм'ер падкрэсліў, што нявыплата даўгоў пагражае Украіне дэфолтам. «А гэта спыненне вытворчасці, дэвальвацыя грыўні, інфляцыя. Таму нам патрэбныя новыя пазыкі, каб вярнуць старыя», — растлумачыў Гройсман, нагадаўшы, што Украіне неабходна 130 млрд грыўняў ($4,6 млрд) штогод на абслугоўванне дзярждоўгу. В.а. міністра фінансаў Украіны Аксана Маркарава паведаміла, што на 30 чэрвеня дзярждоўг Украіны склаў $66,1 млрд.

### НА МЕСЯЦЫ ЗНАЙШЛІ ЗАМЕРЗЛУЮ ВАДУ

Астраномам удалося знайсці канчатковыя доказы наяўнасці вады на канцавоссях Месяца. Вадзяны лёд адшукалі ў цені кратараў, куды ніколі не трапляе сонечнае святло. Адкрыццё здзейсніла каманда навукоўцаў з Гавайскага ўніверсітэта, універсітэта Браўна і аднаго з асноўных аддзяленняў NASA — Даследчага цэнтра Эймса ў Крамянёвай даліне. Па словах навукоўцаў, колькасць і размеркаванне вадзянога лёду па паверхні спадарожніка Зямлі прыкметна адрозніваюцца ад таго, што ўдалося высветліць адносна іншых аб'ектаў у Сонечнай сістэме, дзе вада была знойдзена раней. Гэта звязваюць з унікальнасцю працэсу фарміравання Месяца. Навукоўцы лічаць, што адкрыццё вельмі спатрэбіцца пры далейшым асваенні Месяца, паколькі дасць магчымасць выкарыстоўваць каштоўны рэсурс на месяцы, не дастаўляючы запасы вады з Зямлі.

■ На слыху

# ДЗЕ МОЙ ПЕРШЫ КЛАС?

## Кропкі над «і» будуць расстаўлены толькі 30 жніўня

**У сталіцы больш як дзевяць тысяч сем'яў будучых першакласнікаў падалі заявы ва ўстановы адукацыі не па месцы жыхарства. Пра гэта паведаміла журналістам начальнік аддзела дашкольнай, агульнай сярэдняй і спецыяльнай адукацыі камітэта па адукацыі Мінгарвыканкама Марына ІЛЮШЧЭНЯ. А ўсяго плануецца, што за парты 1 верасня ў Мінску сядзе каля 23 тысяч першакласнікаў, гэта на 1200 чалавек больш, чым у папярэднім годзе.**



Фота Надзеі БУЖАН.

Нагадаем, што пасля адмены экзаменаў у пятыя класы гімназій і ўвядзення тэрытарыяльнага прынцыпу замацавання дзяцей за гэтымі ўстановамі дастаткова вялікая колькасць бацькоў засталася такім рашэннем незадаволеная. Канешне, найбольш актуальная гэта сітуацыя для Мінска, дзе функцыянуе 50 гімназій, прычым пяць з іх раней не мелі пачатковых класаў. Дзве з апошніх усё ж такі набяруць першакласнікаў (13-я і 27-я гімназіі), але ў трох (№ 25, 41 і 42) сёлета набору пакуль не было. Рашэнні аб замацаванні за той ці іншай установай адукацыі канкрэтных вуліц і дамоў прымаліся адміністрацыямі раёнаў сталіцы, і гэту інфармацыю можна знайсці на іх сайтах.

А вось прымаць рашэнне аб залічэнні ў першыя класы не па месцы жыхарства будуць спецыяльныя камісіі, створаныя ў кожнай установе адукацыі, бо ў першую чаргу школа або гімназія абавязана прыняць усіх тых дзяцей, што тэрытарыяльна замацаваны за ёй. І толькі калі застануцца свабодныя месцы, на іх могуць прэтэндаваць іншыя дзеці. Камісіі будуць засядаць 29 жніўня. У іх склад увойдуць намеснікі дырэктараў і педагогі.

— Рашэнне аб залічэнні на свабодныя месцы не будзе прымацца кіраўніком аднаасобна, — запэўніла Марына Ілюшчэня. — Перавагу будуць мець дзеці, чые браты і сёстры ўжо вучацца ў гэтай установе адукацыі, альбо дзеці штатных супрацоўнікаў згаданай школы або гімназіі. Таксама будзе ўлічвацца чарговасць падачы заяў. Аб прынятым рашэнні бацькі будуць праінфармаваныя вусна або ў пісьмовай форме, калі яны пажадалі атрымаць пісьмовы адказ. Бацькам, чые дзеці не пройдуць на свабодныя месцы ў школах і гімназіях, будзе прапанавана звярнуцца ва ўстановы адукацыі, за якімі яны тэрытарыяльна замацаваны.

Спецыяліст падкрэсліла, што ў нарматыўных дакументах дакладна прапісаны ўсе алгарытмы дзеяння кіраўніку установы адукацыі, таму праблемных сітуацый узнікнуць не павінна.

Усяго ў 2018/2019 навучальным годзе ў сталічных школах і гімназіях будуць навучацца больш за 193 тысячы школьнікаў, што амаль на тры тысячы чалавек больш у параўнанні з папярэднім навучальным годам. Ва ўстановах адукацыі адкрыюцца 858 першых класаў і 397 дзясятых класаў, з іх 241 — профільны.

— Сёлета Міністэрства адукацыі прапанавала на выбар дзве даты правядзення ўрачыстых лінеек: 31 жніўня і 1 верасня, — паведаміла **начальнік аддзела выхаваўчай і ідэалагічнай работы камітэта па адукацыі Мінгарвыканкама Ганна РЫСЯВЕЦ.** — Мінск пайшоў па шляху шырокага абмеркавання з удзелам педагогаў, прадстаўнікоў адміністрацый раёнаў і, вядома, бацькоў. У нас вялікая кагорта першакласнікаў, і вельмі важна, каб у гэты дзень бацькі маглі быць разам са сваімі дзецьмі. Па той інфармацыі, якая цяпер да нас паступае, урачыстыя мерапрыемствы плануецца правесці 1 верасня. Такое жаданне выказвае досыць вялікая колькасць бацькоў.

А 3 верасня ў школах і гімназіях сталіцы ў рамках Года малой радзімы пройдуць тэматычныя ўрокі па адзінай тэме «Мне выпала шчасце тут нарадзіцца». Педагогі плануюць правядзенне інтэрактыўных урокаў, урокаў-экскурсій на вуліцах, названых у гонар герояў.

Першы званок прагучыць 1 верасня ў школе-навабудоўлі № 204 па вуліцы Яна Чачота, 18. Новая ўстанова адукацыі разлічана на 1020 месцаў, яна мае басейн, сучасныя спартыўныя пляцоўкі і тэнісныя корты.

Таксама завяршаецца будаўніцтва трох дзіцячых садкоў на 650 месцаў: у мікрараёнах Лошыца-6, Лебядзіны і на вуліцы акадэміка Карскага. З улікам дзіцячага садка, што быў уведзены ў Фрунзенскім раёне па вуліцы Шырмы ў красавіку, у 2018 годзе горад атрымае дадаткова 800 месцаў ва ўстановах дашкольнай адукацыі.

**Надзея НІКАЛАЕВА**

■ Свята ў хату

# САЛІГОРСК ЗАПРАШАЕ СЯБРОЎ!

**У наступны ўік-энд шахцёрская сталіца краіны стане месцам культурнага прыцягнення: на працягу трох дзён тут будзе доўжыцца марафон святочных падзей, прымеркаваных да юбілею горада.**

**24 жніўня** зранку запланаваны ўрачыстая цырымонія на Алеі Гонару і адкрыццё мемарыяльных дошак, а ўвечары пройдуць урачыстыя мерапрыемствы, прысвечаныя Дню шахцёра і 60-годдзю стварэння ААТ «Беларуськалій»: на «Салігорск-Арэну» запрашаюць на канцэрт гурта «Любэ». На Цэнтральнай плошчы гасцей свята чакаюць выстаўка рэтрааўтамабіляў, канцэрт з удзелам Ганны Шаркуновай, Алекса Дэвіда ды іншых выканаўцаў, а таксама летні кінатэатр.

**У суботу, 25 жніўня,** будзе закладзены сквер «Сям'і, Любові і Вернасці», тут усталююць статую заступніцы шахцёраў Варвары, а на вуліцы Падольнай адкрыецца палікліка.

Урачыстае адкрыццё свята запланавана а 15-й гадзіне на Цэнтральнай плошчы, дзе пройдзе карнавальнае шэсце, прысвечанае 60-годдзю горада.

Увечары тут жа адбудзецца святочны гала-канцэрт з удзелам гурта «Чайф», Дзяніса Майданава, а таксама Ядвігі Паплаўскай, Аляксея Хлястова, Іскуі Абалян, «ДаВінчы» ды іншых папулярных артыстаў.

Завершыць гэты дзень лазернае шоу, святочны салют і маладзёжная начная дыскатэка на адкрытым паветры.

**У нядзелю, 26 жніўня,** адбудзецца цырымонія закладкі каменя — як сімвала пачатку будаўніцтва парку па вуліцы Набярэжнай. На вуліцы Леніна стартуе рэспубліканскі лёгкаатлетычны прабег, а на пляцоўцы каля адміністрацыйнага будынка ААТ «Беларуськалій» апоўдні ўсіх запрашае на сваю канцэртную праграму Прэзідэнцкі аркестр Беларусі.

Увечары на Цэнтральнай плошчы гасцей чакае народна-забаўляльная музычна-гумарыстычная праграма з удзелам шоу «Алюр», Зінаіды Фурор, Аляксандра Сухарава, дуэтаў «Піва ўдваіх» і «Гром Бабы», гуртоў «Лялькі Карпарэйшн», «Бацька Атаман», «Цягні-штурхай». Уся гэтая весялосць завершыцца рок-батлам паміж «Gypsy jack» (Салігорск — Масква) і «Дзядзькам Ванем» з Мінска.

На працягу ўік-энду будзе працаваць экскурсійны праект «Маршрут 60», па якім можна будзе адправіцца ад Палаца культуры. Самых смелых запрашаюць у аглядальныя палёты і скачкі з парашутам. У цэнтральнай частцы горада гасцей чакаюць рамесніцкія і гандлёвыя рады, а дзяцей атракцыёны

■ Футбол. Ліга чэмпіёнаў

# Вырашальны гол як вынік эмоцый

## Футбалісты барысаўскага БАТЭ ў дамашнім матчы плэй-оф ЛЧ пацярпелі паражэнне ад галандскага ПСВ

**Матч выдаўся багаты на галы, у стартавым адрэзку гаспадары мелі перавагу і стваралі дастаткова небяспечных момантаў каля варот сапернікаў. Ужо на дзявятай хвіліне фінскі легіянер БАТЭ Ясе Туомінен адкрыў лік пасля перадачы Ігара Стасевіча.**



Аднак паступова ініцыятыву перахапілі прадстаўнікі галандскага клуба і на 35-й хвіліне атрымалі права на пенальці, які рэалізаваў Гастон Перэйра, — 1:1. Пасля перапынку чэмпіёны Нідэрландаў зайгралі яшчэ больш актыўна і на 61-й хвіліне выйшлі наперад — 2:1. Аляксандр Глеб, які выйшаў на замену, зраўняў лік, аднак нічыя гарэла на табло толькі хвіліну, госці зноў выйшлі наперад — 3:2. Пасля гэтага лік сустрэчы не змяніўся. Адзначым, што адолеўшы ў Барысаве БАТЭ ў першым паядынку раўнда плэй-оф Лігі чэмпіёнаў, галандскі ПСВ спыніў 10-матчавую бязвыйгрышную серыю ў еўракубках.

*«Трэці прапушчаны гол — гэта наступства эмоцый, а таксама расканцэнтрацыі ўвагі ў выніку стомы,* — аналізуе матч **галоўны трэнер БАТЭ Аляксей БАГА.** *— Часам мы былі вельмі сабраныя, уважлівыя і, як вынік, гулялі даволі шчыльна і арганізавана, што дазваляла мець добрыя шанцы ў контратаках, а таксама ствараць моманты падчас пазіцыйнага наступлення. Аднак часам былі і залішне няўважлівыя. У цэлым гульня атрымалася хвалепадобнай, ёй не хапіла цэласнасці з нашага боку. Але для аб'ектыўнай ацэнкі трэба разумець, супраць каго і ў якім турніры мы гулялі. Задаволены гульнёй каманды, забітымі мячамі, эмоцыямі, падтрымкай балельшчыкаў, дзейнасцю некаторых футбалістаў. Гэта гістарычная падзея. Калі ў Беларусі хтосьці паўторыць тое, што зрабіў БАТЭ на міжнароднай арэне за 11 апошніх гадоў, я кульнуся каля ГУМа.*

Перад паездкай у Галандыю сітуацыя няпростая. Але пакуль фінальны свісток суддзі ў матчы ў адказ не прагучыць, не збіраемся выкідаць белы сцяг. Лічу, не ўсё яшчэ вырашана ў нашым саперніцтве з ПСВ. Упэўнены, і хлопцы з такімі думкамі будуць рыхтавацца да зваротнага паядынку. Ліга чэмпіёнаў — вельмі цікавы турнір, у якім кожная гульня здольная паднесці сюрпрызы. Але гэта будзе потым. А цяпер, як бы дзяжурна ні прагучала, будзем перабудоўвацца на чэмпіянат краіны».

Паядынак у адказ адбудзецца 29 жніўня на стадыёне «Філіпс» у Эйндхавене. Пераможца па выніку дзвюх сустрэч выйдзе ў групавы этап галоўнага кантынентальнага турніру, той, хто прайграе, працягне еўракубкавы сезон у групе Лігі Еўропы.

***Вынікі іншых сустрэч, што адбыліся 21 жніўня:*** «Бенфіка» (Лісабон, Партугалія) — ПАОК (Салонікі, Грэцыя) — 1:1, «Црвена Звезда» (Бялград, Сербія) — «Зальцбург» (Аўстрыя) — 0:0.

**Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ**

■ Будзь у курсе!

# Даражэе мабільная сувязь і інтэрнэт

**З 1 верасня тарыфы на паслугі павышаюць два аператары мабільнай сувязі.**

Кампанія МТС паведаміла аб павышэнні тарыфаў на асноўныя паслугі сотавай сувязі на 2,9 працэнта. Зменіцца кошт асноўных паслуг электрасувязі і некаторых дадатковых паслуг. Тарыфы на фіксаваную сувязь і роўмінг змяненні не закрануць.

«Вэлком» праінфармавала: павысіцца памер абаненцкай платы, аднаразовых узносаў, а таксама кошт выходных выклікаў на нумары абанентаў Рэспублікі Беларусь, міжнародных званкоў, мабільнага інтэрнэту, sms, mms, спецыяльных і дадатковых паслуг. Павышэнне складзе не больш чым 2,9 працэнта. Змяненні не закрануць кошт тарыфных планаў фіксаванай сувязі, абаненцкую плату тарыфнага плана lemon, а таксама кошт шэрагу дадатковых паслуг.

Інфармацыю пра новыя тарыфы можна знайсці на афіцыйных сайтах мабільных аператараў ці даведацца ў салонах сувязі.

Таксама з 1 верасня павышае кошт некаторых сваіх паслуг РУП «Белтэлекам». Падаражэюць доступ у інтэрнэт, некаторыя пакеты паслуг электрасувязі, кошт паслуг відэаканферэнцыі РУП «Белтэлекам». Павышэнне тарыфаў не закране мясцовую, міжгароднюю і міжнародную тэлефонную сувязь, паслугі хостынгу.

**Надзея НІКАЛАЕВА**

■ Кропка на карце

# Як трапіць у казку?

**Каб убачыць жывую і мёртвую ваду зусім не трэба выпраўляцца за «трыдзевяць зямель». Вы знойдзеце яе недалёк ад вёскі Косічы Навагрудскага раёна. У адным месцы стаяць два калодзежы. Зазірніце ў адзін — вада чыстая, празрыстая, ціхая, бруіцца паволна, бы не хочучы. У другім калодзежы зруб імхом парос, імчыць з яе ручаёк, гамоніць, спяшаецца. Як вы думаеце, дзе ж тут вада мёртвая, а дзе жывая? Аказваецца, гэта важна ведаць, бо і карыстацца вадой трэба ў тым жа парадку, як у казцы. Маўляў, калі проста змяшаць, эфекту не будзе, гэтак жа як і ад адной жывой вады.**



— Мне мясцовая знахарка расказвала, што трэба спачатку выпіць мёртвай вады. Яна ачысціць цела ад усяго дрэннага, а ўжо жывую можна ўжываць толькі праз 3-4 гадзіны — яна прыдасць моцы і здароўя, — расказвае гаспадар аграсядзібы «Бочка», які і паведаміў пра загадкавую мясціну.

Запускаю конаўку ў калодзеж з «лянівай» вадой: «А колькі яе піць?»

— Вы самі зразумееце. Колькі тут розных людзей было. Усе адзначаюць, што многа яе не выпіць, нават у спёку, — заўважае мой праважаты. — Не бойцеся, яна не атрутная, людзі на экспертызу вазілі, вада чыстая, бяспечная, без нейкага асаблівага смаку. Проста зробіце некалькі глыткоў і адчуеце, што больш не хочацца...

Пакрысе гэта мясціна абрастае рознымі легендамі. Паводле адной з іх, крыніцы з'явіліся, калі нейкі манах аб горку, з-пад якой яны сёння б'юць, кіем стукнуў. Паводле другой, быццам знайшоў гэтыя вытокі здароўя чалавек, які доўга хварэў, прычым падказку яму далі манахі аж у Тыбеце, да таго ж заўважылі, што такіх мясцін усяго сем ва ўсім свеце...

Такую дзівосную кропку на карце мая сям'я адкрыла для сябе выпадкова, калі заехала па зусім іншыя легенды на чароўнае возера Свіцязь. У Год малой радзімы мы вырашылі адкрываць для сябе Беларусь. Нашай галоўнай мэтай было паказаць дзецям Брэсцкую крэпасць і Белавежскую пушчу, але па дарозе мы пабачылі шмат цудоўных мясцін і пачулі многа цікавых фактаў, хоць віктарыну складай на тэму «Як вы ведаеце Беларусь?». Вось толькі асобныя, самыя простыя пытанні для яе. Як выглядалі крылатыя гусары і хто гэта такія? У якое абарончае збудаванне ўваход знаходзіўся так высока над зямлёй, што ворагам туды немагчыма было трапіць? Інтэр'ер якой сядзібы змаглі аднавіць дзякуючы апісанням у літаратурным творы? У гонар якога ўраджэнца Беларусі названа самая высокая гара Аўстраліі? Дзе знаходзіцца населены пункт Радасць і якія мясціны з «эмацыянальнымі» назвамі вы ведаеце?

А колькі цікавых людзей можна сустрэць у час такіх падарожжаў! Напрыклад, нам удалося пазнаёміцца з рамеснікам, які зрабіў самую першую манету ў незалежнай сучаснай Беларусі, ён нам нават паказаў газету, дзе пра гэта напісана. Праўда, за тую манету нічога не купіш — яна сувенірная.

Прызнаюся, такое падарожжа-адкрыццё вельмі хочацца працягнуць. І давайце гэта зробім разам. Чаму б не прайсціся сцежкамі краязнаўцаў, не зазірнуць у маленькія школьныя ці нават прыватныя музеі, не паслухаць легенды і паданні, пра якія ведаюць толькі ў вашай вёсцы, не спытаць вады са святых крыніц, не даведацца, дзе працуе жанчына-каваль, не вывучыць мову шапавалаў? А можа, у вас віктарыны ў запасе ёсць? Цікава, ці знойдуць людзі адказы на вашы пытанні...

**Дзяліцеся сваімі адкрыццямі з падарожжаў, расказвайце пра сваю малую радзіму, знаёмцеся з цікавымі людзьмі — і дасылайце свае аповеды і фотаздымкі ў «Звязду». А мы будзем пазначаць гэтыя кропкі на карце, куды сапраўды варта паехаць, і, дасць бог, абавязкова сустрэнемся.**

**Алена ДЗЯДЗЮЛЯ**

# НА ХВАЛЯХ ЗДАРОЎЯ



## Рэабілітацыя для «Ветразя»...

Аздараўленчыя працэдуры на любы густ — ад навамоднай араматэрапіі да пакуль рэдкай у нас кінезітэрапіі, харчаванне — шэсць разоў на дзень, сучасныя нумары, утульная тэрыторыя з мноствам кветнікаў, туй і іншымі элементамі ландшафтнага дэкору, а вакол — хваёвы лес. І гэта не замежны цэнтр, у такіх умовах у беларускай глыбінцы праходзяць бясплатную рэабілітацыю дзеці з асаблівасцямі развіцця.

— Паўтара года таму, калі я ўпершыню прыехаў у «Ветразь», стала зразумела, што давядзецца правесці вялікую работу, каб наладзіць эфектыўную рэабілітацыю і зрабіць цэнтр канкурэнтаздольным на рынку аздараўленчых паслуг, — расказвае **галоўны ўрач Сяргей ПЕТУХОЎ.**

За гэты час толькі дрэў і кустоў было высаджана больш за тры сотні. На алеях і побач з карпусамі з'явіліся паказальнікі ручнога кавання, альтанкі і лаўкі.

Трэба заўважыць, што Сяргей Петухоў, які, дарэчы, сёлета ўзнагароджаны сацыяльнай прэміяй «Палаючае сэрца» на рэспубліканскім конкурсе «Чалавек сваёй справы — 2018», меў значны вопыт арганізатарскай працы. Дзесяць гадоў ён кіраваў Глыбоцкай цэнтральнай раённай бальніцай, і за гэты час медыцынская ўстанова стала адной з найлепшых у Віцебскай вобласці, за што ў 2010-м галоўны ўрач атрымаў ганаровае званне «Чалавек года Віцебшчыны». Пасля быў намеснікам генеральнага дырэктара і галоўным урачом аднаго з самых сучасных санаторных комплексаў краіны — «Пліса». У 2017-м прыняў новы выклік — перайшоў у «Ветразь», якому патрабавалася істотнае абнаўленне.



Заняткі на ўстаноўцы «Экзарта».

Праца пачалася неадкладна, і з таго часу многае змянілася. Удалося не толькі запоўніць пустуючыя месцы. Дзякуючы фінансавай падтрымцы кіраўніцтва Віцебскай вобласці, а таксама за зароблены пазабюджэтныя сродкі адрамантавалі частку жылых карпусоў, закупілі новую мэблю і пасцельную бялізну, абнавілі кухоннае абсталяванне, прывялі ў парадак тэрыторыю, арганізавалі нумары павышанай камфортнасці для тых, хто адпачывае па платных пуцёўках. Рэабілітацыйны цэнтр мяняецца з кожным днём.

## ...і для дзяцей з асаблівасцямі

Але надаць знешні лоск — толькі палова справы. Галоўнае — трэба было асвоіць сучасныя праграмы рэабілітацыі і навучыць персанал найноўшым методыкам, а таксама абнавіць медыцынскае абсталяванне.

— Наша задача — зрабіць рэабілітацыю комплекснай, задзейнічаць не толькі медыцынскі аспект, але і псіхалагічны, і сацыяльна-педагагічны, — тлумачыць Сяргей Юр'евіч. — Важна максімальна сацыялізаваць дзіця з асаблівасцямі, развіць у яго камунікатыўныя навыкі, вырашыць пытанні бытавой адаптацыі, навучыць пры неабходнасці выкарыстоўваць прылады для руху, папросту кажучы, падрыхтаваць да самастойнага жыцця. Таму з дзецьмі ў нас працуюць медыкі рознага профілю: рэабілітолагі, неўролаг і ўрачы іншых спецыялізацый, інструктары лячэбнай фізкультуры, у тым ліку інструктары па кінезітэрапіі (лячэнне рухам) і эрготэрапіі (развіццё, аднаўленне і падтрыманне навыкаў, неабходных чалавеку ў паўсядзённым жыцці), масажысты, спецыялісты па апаратнай фізіятэрапіі, а таксама псіхолагі, лагапед-дэфектолаг, педагогі і выхавальнікі. Сёння дзейнічае адпрацаваная сістэма. Напрыклад, для дзіцяці з ДЦП мультыдысцыплінарная брыгада спецыялістаў вызначае комплексную праграму і ставіць задачы на трохтыднёвы цыкл нашай стацыянарнай рэабілітацыі. Яны вырашаюць, якія методыкі будуць прымяняцца, якую апаратную фізіятэрапію трэба прызначыць, з якімі зонамі папрацуюць масажысты, як будуць дзейнічаць псіхолаг і лагапед. Праз тры тыдні аналізуем вынік і даём рэкамендацыі бацькам для далейшай самастойнай работы.

Варта заўважыць, што прыкладаў вялікіх поспехаў сваіх маленькіх пацыентаў можа прывесці кожны спецыяліст лячэбнага аддзялення цэнтра. Хлопчыка з ДЦП з Пастаў, які разам з татам штогод прыязджае на рэабілітацыю, ведаюць тут, здаецца, усе. Ён пакуль не можа хадзіць і дрэнна размаўляе, але з кожным годам адбываецца прыкметны прагрэс. «Хлопчык складаны, але дзякуючы бацькам, якія з ім пастаянна займаюцца і дома, і з нашай дапамогай, мы бачым, што яго стан паступова мяняецца да лепшага», — кажуць у цэнтры. Для персаналу, як і для бацькоў, кожны новы рух, новая ўсмешка — вялікая радасць і стымул працаваць далей.

І хоць медыкі цэнтра сцвярджаюць, што цудаў не бывае і за 21 дзень кардынальныя змены немагчымыя, гісторыі некаторых пацыентаў інакш як цудам не назавеш. Дзяўчына-падлетак з Віцебска з дыягназам ДЦП (падчас хадзьбы ў яе дрэнна рухаліся рука і нага) таксама штогод праходзіла рэабілітацыю ў цэнтры. У адзін з заездаў ёй прызначылі танцавальную тэрапію ў групе са здаровымі падлеткамі. І вынік перасягнуў усе чаканні: менавіта ў танцы яе недахоп амаль цалкам знік.

— Дасягненні нашай медыцыны дазваляюць сёння выходжваць неданошаных дзетак ад 500 грамаў. На жаль, часам яны маюць некаторыя неўралагічныя адхіленні ў развіцці. Таму колькасць нашых патэнцыйных наведвальнікаў не змяншаецца, — канстатуе Сяргей Петухоў. — У эканамічна развітых краінах, як, зрэшты, і ў нас, колькасць дзяцей, якія маюць складаныя хранічныя хваробы, асаблівасці развіцця і інваліднасць, прыкладна 7-8 %. Таму мы мэтанакіравана займаемся захворваннямі пульманалагічнага, кардыялагічнага, апорна-рухальнага профіляў і акцэнтавана развіваем тэхналогіі рэабілітацыі з неўралагічнымі паталогіямі, бо да нас трапляе значны працэнт дзетак з ДЦП.

І ўжо сёння спецыялісты цэнтра, якія прайшлі стажыроўку і навучанне ў Беларусі і за мяжой, дакладна ведаюць, як ім дапамагчы. Інструктар па кінезітэрапіі разам з дзіцем асвойвае новы рух, здымае спазм і ўдасканальвае работу мышцаў, якія адстаюць у развіцці. Частка практыкаванняў выконваецца на ўстаноўцы «Экзарта», якая складаецца з сістэмы падвесаў (петлі, тросы, жгуты) і дапамагае ліквідаваць спазмы і болевы сіндром, аднавіць аб'ём руху ў пазваночніку і суставах, актывізаваць глыбокія мышцы. Такія заняткі праходзяць у падвешаным стане, калі нервова-мышачная сістэма губляе раўнавагу, такім чынам адбываецца яе своеасаблівая перазагрузка. Развіць поспех дапамагаюць масаж, фізіятэрапія і заняткі па развіцці дробнай маторыкі кісці.

— Рэабілітацыя дзяцей з ДЦП — гэта індывідуальная праца, бо ў кожнага з іх — свая праблема. І такі працэс вымагае больш глыбокага навучання персаналу, чым мы і займаемся пастаянна. Дзякуй галоўнаму ўпраўленню па ахове здароўя Віцебскага аблвыканкама, якое падтрымлівае нашы ініцыятывы і спрыяе іх рэалізацыі, — кажа Сяргей Петухоў.

## А суседзі галасуюць рублём

Але зарабляе цэнтр і самастойна. Два апошнія гады ў «Ветразь» на аздараўленне прыязджаюць расійскія дзеці. Летась у цэнтры адпачывала 200 дзяцей з прыватнай матэматычнай школы Санкт-Пецярбурга разам з выкладчыкамі, сёлета іх прыехала ўжо 300. Наяўнасць уласнай школы на тэрыторыі, а таксама вялікай спартыўнай залы і спартыўных пляцовак, цэнтра вольнага часу і шырокага пераліку аздараўленчых працэдур — усё гэта працуе на карысць «Ветразя». У жніўні тут адпачываюць і трэніруюцца выхаванкі адной з маскоўскіх школ мастацкай гімнастыкі. Галоўны ўрач прызнаецца, што канкурэнцыя на рынку санаторна-аздараўленчых і рэабілітацыйных паслуг сёння вялікая, але пры выбары месца для аздараўлення расіяне спыніліся на «Ветразі»:

— Гэтым летам мы не змаглі прыняць усіх ахвотных, нягледзячы на тое, што ў дадатак да 250 ранейшых месцаў арганізавалі яшчэ 50. Дзякуючы гэтаму, дарэчы, наш Пастаўскі раён, а таксама суседнія Глыбоцкі і Шаркаўшчынскі рэалізавалі праграму па аздараўленні дзяцей-сірот. Паказальна, што, пабываўшы ў нас па бюджэтнай пуцёўцы, бацькі часта браніруюць яшчэ адну праз паўгода — за ўласны кошт. Значыць, нашы рэабілітацыйныя праграмы даюць вынік, такім чынам, мы на правільным шляху.

**Алена КРАВЕЦ.**

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

ЧЫРВОНКА
ЧЫРВОНАЯ ЗМЕНА
23 ЖНІЎНЯ 2018 г.
ЧАЦВЕР
№ 16 (15847)
Выдаецца з 21 красавіка 1921 года

Імёны


Фота Ганны ЗАНКАВІЧ.

## Кацярына ПЕРАПЯЧАЕВА:
# «БІЛЬЯРД ДЛЯ МЯНЕ — САПРАЎДНАЯ СТРАСЦЬ»

**Яна пачала займацца гэтым відам спорту, не мяркуючы, што ён ператворыцца ў прафесію. Пасля перапынку ў спартыўнай кар'еры дзяўчына выйграла чэмпіянат краіны, потым паднялася на п'едэстал чэмпіянату Еўропы, а сёлета ў красавіку стала чэмпіёнкай свету. У Кацярыны Перапячаевай ужо ёсць і свае вучні, якія таксама пачынаюць заваёўваць першыя перамогі. У інтэрв'ю наша гераіня расказала пра асаблівасці більярда, дрэс-код на спаборніцтвах і фінансавы бок спорту.**

***— Кацярына, ці праўда, што ў більярдзе вы знайшлі сябе не адразу?***

— Так, знаёмства з ім адбылося ў 13 гадоў. Тата ўбачыў у газеце аб'яву, параіў мне запісацца. Я дайшла да більярднай, яна звалася тады «Карамболь», і вярнулася дадому, таму што пасаромелася зайсці, была вельмі сціплая. Але тата адправіў мяне назад і сказаў: «Пакуль не запішашся, не вяртайся!» У першы ж дзень мяне запрасілі да стала, я там нават пазабівала нейкія шары, усё так спадабалася. Хоць да гэтага я ніколі не гуляла.

Більярд мяне адразу зацікавіў, але гэта было як страсць, якая потым патухла. З'явіліся іншыя інтарэсы, уласцівыя падлеткам. Праз тры гады вырашыла, што трэба ўсё ж такі чымсьці займацца, і вярнулася, акунулася ў більярд ужо з галавой. З гэтага моманту ў мяне з'явілася мэта — дасягнуць выніку. Заўсёды дапамагаў і матываваў тата, задаючы пытанне: «Дзе прызавыя месцы, Каця?»

*(Заканчэнне на 8-й стар. «ЧЗ».)*

Паралелі

# ВЫСОКАЯ ЦАНА ДЫПЛОМА

### Чаму вынікі ўступных экзаменаў нярэдка шакіруюць грамадскасць?

**Гэтым летам адразу ў некалькіх краінах выбухнулі скандалы, звязаныя з паступленнем у вышэйшыя навучальныя ўстановы. За сумленныя экзамены спрабуюць змагацца паўсюдна, прычым самымі рознымі спосабамі, уключаючы ўстаноўку металадэтэктараў на ўваходзе ў экзаменацыйныя аўдыторыі і адключэнне на час нацыянальных экзаменаў інтэрнэту ў краіне, але, як аказалася, не заўсёды паспяхова...**


Фота Ганны ЗАНКАВІЧ.

## Дзяўчаты — лішнія?

Так, выпадкова высветлілася, што ў Такійскім медыцынскім універсітэце шмат гадоў запар заніжалі вынікі ўступных экзаменаў абітурыентkам для таго, каб прыняць на вучобу больш мужчын. На думку кіраўніцтва ўніверсітэта, студэнты мужчынскага полу з большай імавернасцю ў далейшым будуць працаваць па спецыяльнасці. Да таго ж мужчыны-ўрачы больш падрыхтаваныя да начных змен, вялікіх нагрузак і дзяжурстваў у службе хуткай дапамогі. Вынікі экзаменаў пачалі карэктаваць пасля таго, як у 2010 годзе колькасць жанчын, якія паступілі ва ўніверсітэт, рэзка вырасла ў параўнанні з папярэднімі гадамі. Дзяўчат сярод першакурснікаў аказалася 40 працэнтаў, а раней гэты паказчык быў удвая меншы.

Кіраўніцтва Такійскага медыцынскага ўніверсітэта ўжо папрасіла прабачэння ў грамадскасці за махінацыі з уступнымі экзаменамі. Акрамя таго, урад Японіі заявіў аб намеры правесці праверкі ва ўсіх медыцынскіх ВНУ краіны. А тым часам пасольствы Францыі і Фінляндыі пасля скандалу з заніжэннем адзнак прапанавалі японкам паступаць у іх медыцынскія ВНУ.

Расійскім дзяўчатам таксама не пашанцавала: так, у Татарстане падчас правядзення адзінага дзяржаўнага экзамену (АДЭ) вучаніцу 11 класа прымусілі зняць частку бялізны перад мужчынамі-ахоўнікамі толькі таму, таму што металадэтэктар звінеў, а прычына ім была незразумелая. Пазней пра аналагічныя выпадкі паведамілі і іншыя выпускніцы...

*(Заканчэнне на 2-й стар. «ЧЗ».)*

Трэці працоўны

# ДАХОДНЫЯ КАНІКУЛЫ Ў «НАВУЦЫ»

**На Чэрвеньшчыне варыянтаў падпрацоўкі для падлеткаў падчас канікулаў некалькі. Адзін з іх — у Мінскай абласной сельскагаспадарчай доследнай станцыі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, якую ў народзе называюць проста: «Навука».**

Да яе ад Чэрвеня, лічы, рукой падаць: яна месціцца ў вёсцы Натальеўск, прыкладна за два кіламетры ад райцэнтра. «Навука» займаецца вырошчваннем гароху, збожжа, бульбы ды іншага. Патрабуецца шмат рабочых рук. Клопатаў, у тым ліку і летам штогод, — процьма, таму на дапамогу заўжды прыходзяць хлопцы і дзяўчаты ад чатырнаццаці гадоў, якія мараць пра свой заробак.

Для таго каб уладкавацца на станцыю, падлеткам неабходна прынесці медыцынскую даведку, заяву з подпісам бацькоў і пашпарт. Калі ўсё ў парадку, ім робяць пасведчанне аб страхоўцы і праводзяць інструктаж. Трэба заўжды быць пільнымі: побач працуюць пагрузачныя машыны, камбайны, трактары. Галаўны ўбор — абавязковы атрыбут падлеткаў на полі: гарачае летняе сонца не шкадуе нікога. Хлопцам і дзяўчатам не дазваляюць працаваць з хімікатамі — небяспечна і шкодна. Таксама іх моцна не нагружаюць, кожнаму — па магчымасцях. Графік у падлеткаў вольны, штодзень працаваць не прымушаюць.

*(Заканчэнне на 4-й стар. «ЧЗ».)*


Аліна Скуратовіч працуе ў ангары.

# ВЫСОКАЯ ЦАНА ДЫПЛОМА




## Пасля экзамену — у суд

Увогуле, у Расіі, напэўна, не было ніводнай кампаніі па правядзенні адзінага дзяржаўнага экзамену, якая б не суправаджалася чуткамі пра маштабную ўцечку экзаменацыйных матэрыялаў. У інтэрнэце актыўна абмяркоўваецца, хто і як «зліває» заданні ў сецiва. Выпускнікі пацвярджаюць, што менавіта тыя, якія гуляюць па інтэрнэце, або вельмі падобныя на іх былі на адзіным дзяржаўным экзамене. Аднак Федэральная служба па наглядзе ў сферы адукацыі і навукі традыцыйна факты ўцечкі экзаменацыйных матэрыялаў катэгарычна абвяргае.

Між іншым, сёлетняя прыёмная кампанія азнаменавалася ў Расіі яшчэ і зваротам аднаго з удзельнікаў АДЭ ў суд. Выпускнік навасібірскай гімназіі Арцём Весялоў стаў першым школьнікам, які вырашыў аспрэчыць вынікі дзяржэкзамену ў судзе. Да гэтага апошні разглядаў толькі справы аб парушэнні рэгламенту правядзення АДЭ.

Хлопец не пагадзіўся з рашэннем экспертаў. У адным з заданняў выпускнік павінен быў даць азначэнне гіперінфляцыі, у іншым — напісаць міні-сачыненне пра эканоміку. Адказ на адно з іх прызналі няправільным, таму што абітурыент спаслаўся на падручнік Вышэйшай школы эканомікі, якога няма ў пераліку афіцыйна рэкамендаваных для вывучэння ў школе. У другім выпадку эксперты палічылі недастатковым узровень яго аргументацыі.

Па выніках АДЭ Арцём Весялоў атрымаў 88 балаў. Агульная колькасць набраных балаў дазволіла яму паступіць у Вышэйшую школу эканомікі (ВШЭ), але выпускнік вырашыў пайсці да канца: па словах хлопца, яго мэта — стварыць прэцэдэнт, дзякуючы якому правілы тэсціравання будуць удасканалены. «Спадзяюся, што яны або будуць складаць пытанні, на якія можа быць дадзены толькі адназначны адказ і якія не з'яўляюцца дыскусійнымі, або стануць даваць большую свабоду ў ацэнцы адказаў выпускнікоў», — растлумачыў малады чалавек сваю прынцыповую пазіцыю.

## На чым «засыпаліся» выпускнікі?

Не абышлося без узрушэнняў і ў Казахстане, дзе Нацыянальны цэнтр тэсціравання Міністэрства адукацыі і навукі звярнуўся да Міністэрства ўнутраных спраў з просьбай разабрацца з сітуацыяй вакол з'яўлення фатаграфій тэставых заданняў Адзінага нацыянальнага тэсціравання 2018 года ў сацыяльных сетках.

Ва Украіне прыёмная кампанія сёлета зведала шмат змяненняў. У прыватнасці, была ўстаноўлена мінімальная колькасць балаў для паступлення на медыцынскія спецыяльнасці, уніфікаваны пералік прадметаў на аналагічных спецыяльнасцях у розных ВНУ, перагледжаны рэгіянальныя, галіновыя і сельскія каэфіцыенты, па якіх разлічваўся конкурсны бал. Але ў цэнтры ўсеагульнай увагі аказаліся найперш несуцяшальныя вынікі знешняга незалежнага тэсціравання: кожны сёмы абітурыент гэтага года праваліў яго, не набраўшы неабходнага мінімуму балаў. Тэст па ўкраінскай мове не здалі 14,5 працэнта выпускнікоў (каля 47 тысяч чалавек). Тэст па гісторыі правалілі 23 тысячы ўчарашніх школьнікаў. Матэматыку не здалі каля 19 працэнтаў удзельнікаў тэсціравання — прыкладна 20 тысяч чалавек. Англійскую мову, на тэсціраванні па якой у гэтым годзе ўпершыню прымянялася аўдзіраванне, не здалі 11 тысяч чалавек (13 працэнтаў удзельнікаў).

Міністр замежных спраў Украіны Павел Клімкін выказаў сваё незадавальненне з нагоды вынікаў знешняга незалежнага ацэньвання па матэматыцы ў «Фэйсбуку». Ён прызнаўся, што быў шакіраваны ўзроўнем падрыхтоўкі ўкраінскіх абітурыентаў. «Шчыра кажучы, хочацца біць трывогу. Гэта ж татальная катастрофа!» — напісаў ён.

48 працэнтаў украінскіх абітурыентаў не змаглі рашыць задачу ўзроўню восьмага класа. Палова выпускнікоў не арыентуецца ў элементарных матэматычных правілах... «Вас гэта не шакіруе?» — задаецца пытаннем дыпламат.

## Нуль на фінішы...

А што вядома пра вынікі ўдзельнікаў цэнтралізаванага тэсціравання ў Беларусі? Шчыра кажучы, з кожным годам інфармацыя, якую агучваюць грамадскасці, робіцца ўсё больш лаканічнай.

У 2018 годзе для ўдзелу ў ЦТ зарэгістраваліся крыху больш як 82,4 тысячы абітурыентаў. Стабальныя сертыфікаты атрымалі 392 чалавекі, з іх 16 маюць найвышэйшы бал па двух прадметах. Сярод стабальнікаў аказаліся і выпускнікі мінулых гадоў (53 чалавекі). Узнікае цалкам заканамернае пытанне: хто гэтыя «шчасліўцы»? Сапраўдныя абітурыенты, нацэленыя на атрыманне адукацыі, ці настаўнікі і рэпетытары, якія ідуць на ЦТ зусім для іншых мэт? Калі размова ідзе пра педагога (а забараніць ім рэгістравацца на ЦТ немагчыма), то гэта азначае, што насамрэч колькасць стабальнікаў сярод абітурыентаў меншая на паўсотню.

**Кожнаму тэставаму заданню будзе прысвойвацца першасны бал, яго абітурыенты будуць ведаць яшчэ да пачатку ЦТ.**

Афіцыйна заяўлена, што максімальныя вынікі былі зарэгістраваныя сёлета па ўсіх прадметах, калі, канешне, разглядаць замежную мову як адзін прадмет. 100 балаў на ЦТ па матэматыцы набралі 155 чалавек — гэта ўдвая больш, чым у папярэднім годзе (летась было 69 абсалютных вынікаў). Вырас таксама і сярэдні бал па матэматыцы: у 2017 годзе — 27,21 а ў гэтым — 32,32. Нуль балаў набралі 52 чалавекі.

Максімальны вынік на цэнтралізаваным тэсціраванні па беларускай мове атрымаў 21 удзельнік экзамену (летась было 35). А з нулявым на фініш прыйшлі тры чалавекі. Тэсціраванне па беларускай мове абітурыенты таксама напісалі лепш, чым летась: сярэдні бал склаў 35,92 (у мінулым годзе быў 34,25). Акрамя таго, зменшылася колькасць тых, хто не перасягнуў ніжняга парогавага значэння на ЦТ. Менш за 10 балаў па беларускай мове ў гэтым годзе набралі 1335 абітурыентаў, што склала 5,6 працэнта ад агульнай колькасці. У мінулым годзе іх было болей — 2040 чалавек (7,5 працэнта).

ЦТ па рускай мове на 100 балаў здалі 54 чалавекі. Нагадаем, што гэты прадмет быў самым масавым: яго здавалі амаль 67 тысяч чалавек. Летась стабальнікаў на ЦТ па рускай мове было 66. Менш за 10 балаў на тэсце па рускай мове набралі сёлета 4,5 працэнта ад агульнай колькасці ўдзельнікаў экзамену (2906 абітурыентаў), гэта значна менш, чым у папярэднім годзе, калі ніжні парог не пераадолелі 7,6 працэнта тых, хто паступаў (5527 чалавек). Сярэдні бал па прадмеце склаў 37,6 (у 2017 годзе — 34,64). На нуль балаў рускую мову напісалі шэсць чалавек (летась такіх было аж 17).


Фота Ганны ЗАНКАВІЧ.

На ЦТ па біялогіі было выдадзена 11 стабальных сертыфікатаў (у 2017 годзе — 18). Толькі адзін удзельнік паказаў нулявы вынік. Сярэдні бал ЦТ па біялогіі ў гэтым годзе склаў 37,85 (у 2017 годзе — 33,31).

Тэст па грамадазнаўстве на 100 балаў напісалі 11 абітурыентаў. У 2017 годзе было 16 стабальнікаў па гэтай дысцыпліне. Нуль балаў атрымалі 15 абітурыентаў. У мінулым годзе такіх было 13 чалавек. Сярэдні бал за тэст па грамадазнаўстве склаў 43,73. Гэты паказчык таксама аказаўся вышэйшы за леташні (41,76).

Па гісторыі Беларусі максімальны бал атрымалі 10 абітурыентаў (у 2017 годзе — 19). Усяго адзін чалавек здаў тэст на нуль балаў. Сярэдні бал — 36,93.

На англійскай мове 94 абітурыенты набралі 100 балаў, а 12 чалавек не справіліся ні з адным заданнем і атрымалі нуль. Сярэдні бал за гэты прадмет — 44.

Традыцыйна самай праблемнай дысцыплінай для абітурыентаў застаецца фізіка. Захавалася гэта традыцыя і сёлета. Прычым калі па іншых прадметах вынікі абітурыентаў палепшыліся, то па фізіцы яны, у параўнанні з 2017 годам, крыху знізіліся. Сярэдні паказчык склаў 26,9 бала. Але ні колькасць стабальнікаў, ні колькасць нулявых вынікаў, ні колькасць абітурыентаў, якія не пераадолелі ўстаноўлены парог па гэтай дысцыпліне, ужо не першы год не называюцца. І нікто ў званы не б'е, быццам бы праблем з засваеннем фізікі ў школе не існуе. Між іншым, гэта тая дысцыпліна, без якой немагчыма навучацца на тэхнічных спецыяльнасцях. Менавіта «фізіка» не можа ўкамплектавацца на педагагічных спецыяльнасцях, а калі бюджэтныя месцы ўсё ж такі, хоць і не без праблем, запаўняюцца, то прахадныя балы там складваюцца выключна сімвалічныя. Часта абітурыентам дастаткова проста пераадолець мінімальны парог, каб стаць першакурснікам. Таму жарты накшталт «Трэба фізіку ў школах проста адмяніць» даволі актыўна цыркулююць у інтэрнэце.

## Ва ўсім вінаватыя тэсты?

Бадай што галоўнай адметнасцю апошняй прыёмнай кампаніі ў Беларусі стала мадэльная апрабацыя новай методыкі падліку вынікаў ЦТ. Арганізатары цэнтралізаванага тэсціравання запэўніваюць, што вынікі ўдзельнікаў тэсціравання гэтага года ацэньваліся па старой методыцы, якая зацвярджалася загадам Міністэрства адукацыі і выкарыстоўвалася на працягу больш чым 12 гадоў. У многіх узнікае заканамернае пытанне, а чаму ранейшая сістэма падліку балаў перастала задавальняць? Быццам бы нараканняў на яе з боку абітурыентаў не было...

— Методык апрацоўкі вынікаў тэстаў у свеце шмат — ад вельмі простых да вельмі складаных. Мы збіраемся знайсці залатую сярэдзіну: каб для нашых грамадзян гэты падыход быў больш зразумелы і каб адначасова выконваліся дзве функцыі — ранжыравання і ацэньвання ведаў, — анансаваў будучыя змяненні яшчэ зімой **дырэктар Рэспубліканскага інстытута кантролю ведаў Юрый МІКСЮК.**

Трэба заўважыць, што прапановы пераглядзець сістэму падліку балаў удзельнікаў ЦТ гучалі ўжо даўно. Галоўны аргумент — бацькам незразумела, чаму іх дзіця атрымлівае ў школе «васьмёркі» па прадмеце, а на тэсціраванні набірае ўсяго 30 балаў. Маўляў, калі сярэдні бал атэстата выпускнікоў па краіне — 7 балаў, а па выніках цэнтралізаванага тэсціравання — 4,7, то ўзнікаюць пытанні. Або школы завышаюць адзнакі, або вінаватыя тэсты?

**Жарты накшталт «Трэба фізіку ў школах проста адмяніць» даволі актыўна цыркулююць у інтэрнэце.**

Растлумачым, што на сённяшні дзень у аснову методыкі разліку тэставага бала на ЦТ пакладзена шкала, якая дазваляе не толькі прыняць пад увагу колькасць правільна выкананых заданняў тэста, але і падлічыць адносную складанасць кожнага выкананага ці нявыкананага задання, а яна залежыць ад таго, колькі абітурыентаў з ім справіліся. Гэта методыка вельмі добра падыходзіць для ранжыравання абітурыентаў, асабліва на спецыяльнасцях, дзе прахадныя балы проста зашкальваюць, як, напрыклад, на факультэце міжнародных адносін ці на IT-спецыяльнасцях...

Новая методыка, як абяцаюць, стане больш празрыстая: кожнаму тэставаму заданню будзе прысвойвацца першасны бал, яго абітурыенты будуць ведаць яшчэ да пачатку ЦТ. Гэты бал залежыць ад некалькіх паказчыкаў: узроўню складанасці задання, формы яго прадстаўлення, у якой частцы тэста знаходзіцца заданне (у вобласці А ці В), адкрытае яно ці закрытае. Затым у працэсе праверкі работ будуць уведзены каэфіцыенты, а далей будзе разлічвацца бальнікова тэставы бал.

Ініцыятары змяненняў убачылі ў новай шкале шмат плюсаў. Праўда, у чым яны заключаюцца, не растлумачылі. Няцяжка спрагназаваць, што вялікая колькасць стабальных вынікаў істотна ўскладніць задачу ранжыравання. Таму чарговы жарт у тэму: «Каб не атрымалася так, што перайшлі ад пяцібальнай да дзесяцібальнай сістэмы і ўсе навучаюцца на «пяцёркі»...».

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)*

СУМЕСНЫ ПРАЕКТ
БРСМ СКАРБОНКА ДОБРЫХ СПРАЎ ЧЫРВОНКА

# Пажыць і папрацаваць у... манастыры

**Рэспубліканская дабрачынная акцыя «Аднаўленне святынь Беларусі» гэтым разам скіравалася ў Смалявіцкі раён, дзе валанцёры БРСМ добраўпарадкуюць тэрыторыю Лядзенскага Свята-Благавешчанскага мужчынскага манастыра.**

Сюды прыехалі студэнты БДУІР. Цягам тыдня маладыя людзі будуць і жыць і працаваць менавіта тут, у сценах манастыра, што, як чакаецца, дапаможа ім бліжэй пазнаёміцца з гісторыяй святыні. Валанцёры, апроч добраўпарадкавання тэрыторыі, аказваюць дапамогу ў сельскагаспадарчых работах.

Нагадаем, што дабрачынны праект «Аднаўленне святынь Беларусі» рэалізуецца ў краіне з 2013 года. Валанцёрскі рух «Добрае Сэрца» сумесна з асноўнымі канфесіямі праводзіць працоўныя акцыі, скіраваныя на добраўпарадкаванне і аднаўленне храмаў, манастыроў, свяцілішчаў, прыдарожных крыжоў, святых крыніц, арганізуе адкрытыя дыялогі духоўна-маральнай накіраванасці, распрацоўвае новыя экскурсійныя маршруты «Святыні Беларусі».

Акрамя дапамогі Лядзенскаму Свята-Благавешчанскаму мужчынскаму манастыру ў Смалявіцкім раёне, сёлета валанцёры «Добрага Сэрца» задзейнічаны ў добраўпарадкаванні тэрыторый храма ў гонар Сабора Усіх Беларускіх Святых у Гродне, Свята-Траецкага Маркавага мужчынскага манастыра ў Віцебску, храма іконы Божай Маці «Збавіцелька» ў Жодзіне і многіх іншых.

Арганізатарамі акцыі выступаюць БРСМ, Апарат Упаўнаважанага па справах рэлігій і нацыянальнасцяў, рэлігійныя арганізацыі Беларусі.

Летась з актыўным удзелам валанцёраў БРСМ добраўпарадкаваны 283 культавыя аб'екты.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

*Да вытокаў*

# НАТХНЕННЕ — У АРХІТЭКТУРЫ ПРОДКАЎ

**Міністэрства архітэктуры і будаўніцтва і Нацыянальны цэнтр мастацкай творчасці дзяцей і моладзі арганізуюць Рэспубліканскую выстаўку-конкурс дзіцячай творчасці «АрхНавацыя-2018», прысвечаную Году малой радзімы.**

Да ўдзелу ў ёй запрашаюцца навучэнцы аб'яднанняў па інтарэсах устаноў дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі і іншых устаноў адукацыі і культуры, а таксама індывідуальныя ўдзельнікі ва ўзросце ад чатырох да дваццаці гадоў.

Конкурс пройдзе ў чатыры этапы: адборачныя — у верасні, а заключны этап — у кастрычніку — лістападзе.

Да разгляду журы прымаюцца жывапісныя і графічныя работы, архітэктурныя макеты, выкананыя з любых матэрыялаў, мастацкія фатаграфіі, відэаролікі працягласцю да трох хвілін. Згодна з умовамі конкурсу, творчыя работы павінны адпавядаць адной з заяўленых тэм: «Архітэктура малой радзімы», «Знакамітыя архітэктары Беларусі», «Разумны дом» ці «Вытокі адукацыі».

Пераможцы і прызёры выстаўкі-конкурсу ў кожнай намінацыі і ўзроставай катэгорыі будуць узнагароджаны дыпломамі I, II і III ступені Міністэрства архітэктуры і будаўніцтва і прызамі.

Да таго ж з 11 кастрычніка па 25 лістапада ў Нацыянальным цэнтры мастацкай творчасці дзяцей і моладзі будзе арганізавана выстаўка самых цікавых работ конкурсу «АрхНавацыя-2018». Найбольш удалыя творы будуць выкарыстаны ў выдавецкай справе: пры стварэнні тэматычных буклетаў, календароў і іншай рэкламнай прадукцыі.

З больш падрабязнай інфармацыяй аб правядзенні выстаўкі-конкурсу можна азнаёміцца на сайце Нацыянальнага цэнтра мастацкай творчасці дзяцей і моладзі.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

*Проста аб складаным*

# ФІЗІКА, ЗРАЗУМЕЛАЯ І ЛІРЫКАМ,

## або Калі малюнак — лепшы за тысячу слоў

**Як працуе гідраэлектрастанцыя, чаму пуга шчоўкае, а вышыня Эйфелевай вежы залежыць ад пары года? Аспірант БДУ Павел ЛАБАЦЭВІЧ вядзе акаўнт у «Інстаграме» «Фізіка для ўсіх», дзе з дапамогай зразумелых малюнкаў адказвае на гэтыя і іншыя пытанні. За праектам сочаць амаль пяць тысяч падпісчыкаў, сярод якіх ёсць нават іранцы і аўстралійцы.**



У дзяцінстве Павел любіў чытаць энцыклапедыі: пра дыназаўраў, ваенную тэхніку, планеты. Таму, калі ў школе пачалася фізіка, хлопцу яна падалася вельмі лёгкай. «Там збольшага апісваюцца з'явы, якія мы сустракаем у жыцці. Узяць воль сілу прыцягнення — гэта ж лагічна, што ўсе целы падаюць!» — кажа ён.

Потым былі алімпіяды, вучоба на фізічным профілі ў ліцэі БДУ. У год, калі Павел паступаў ва ўніверсітэт, прахадны бал на фізфак быў чамусьці вельмі нізкі — 108. Аспірант жартуе: са сваім атэстатам і сертыфікатамі ЦТ тры разы туды мог прайсці. Падчас вучобы ў БДУ хлопец актыўна ўдзельнічаў у грамадскім жыцці: узначальваў савет па якасці адукацыі, выступаў у праекце «Навука на пальцах», дзе расказваў пра свае даследаванні зразумелай мовай студэнтам іншых спецыяльнасцяў.

— Летась у БНТУ паступаў мой брат. Я яму крыху дапамагаў рыхтавацца і сам таксама вырашыў схадзіць на ЦТ. Мне падалося, што фізіка ў мінулым годзе была куды прасцейшай, чым калі я паступаў. Праўда, можа, справа ў тым, што гэта я за час вучобы паглыбіў свае веды? Але брату было складана. Мне стала не па сабе, што фізіка застаецца на ўзбочыне, і я вырашыў стварыць праект, каб папулярызаваць гэту навуку.

Павел падумаў, што лепш за ўсё будзе рабіць малюнкі і пісаць кароткае тлумачэнне пад імі — калі сам спрабуе з нечым разабрацца, часта звяртаецца да схем. Найлепшай сацыяльнай сеткай для такога фармату быў «Інстаграм». Акаўнт хлопец стварыў у сярэдзіне чэрвеня мінулага года і паставіў сабе ўмову: калі да канца лета не будзе тысячы падпісчыкаў, перастане гэтым займацца. Да верасня планка была ўзята.

Раскруціць справу аспірант спрабаваў многімі спосабамі. Напрыклад, падпісваўся на вялікую колькасць старонак карыстальнікаў сеціва, каб яго праект паказвалі ў рэкамендацыях. Прыкінуў, што, калі падпісацца на тысячу, шостая частка ад гэтай колькасці стане тваімі чытачамі. Публікацыі хлопец робіць пераважна ў восем вечара — каб захапіць і беларускую, і амерыканскую аўдыторыю (цяпер старонка вядзецца на трох мовах: рускай, англійскай і французскай). А яшчэ лепш размяшчаць пасты ў канцы тыдня, бо ў панядзелак-аўторак аўдыторыя «мёртвая».

Сярод падпісчыкаў пераважаюць школьнікі, студэнты і маладыя выкладчыкі. Тры чвэрці чытачоў — ва ўзросце ад 18 да 34 гадоў. Тых, каму 13—17 гадоў, — сем працэнтаў. Сочыць за праектам і катэгорыя 60+ (такіх адзін працэнт). Дзве траціны падпісчыкаў — мужчыны. Калі глядзець па краінах, то большасць аўдыторыі з Беларусі (16 працэнтаў). Актыўна праглядаюць акаўнт таксама жыхары Індыі, ЗША і Расіі. Павел усміхаецца: неяк яму пісалі хлопцы з Інданезіі, прасілі дапамагчы рашыць задачу.

У найбольшай ступені падпісчыкі цікавяцца такімі раздзеламі навукі, як астрафізіка і квантавая фізіка. Апошняя, прызнаецца аспірант, насамрэч складаная. Бо ў свеце атамаў дзейнічаюць абсалютна іншыя законы, якія нам цяжка ўявіць. Умоўна кажучы, там існуе пэўная доля імавернасці, што




Прынцып работы гідраэлектрастанцыі.




Як адкаркаваць бутэльку з дапамогай запальнічкі.

прадмет можа прайсці скрозь сцяну і нічога не разбурыць.

Малюнкі Павел робіць ад рукі. На стварэнне аднаго паста можа пайсці ад дзвюх гадзін да некалькіх дзён. Некаторыя рэчы, пра якія хлопец расказвае ў «Інстаграме», для яго самога былі ў навіну:

— З апошняга — як адкрыць бутэльку віна з дапамогай запальнічкі. У інтэрнэце ўбачыў гэта відэа і падумаў, што трэба растлумачыць, чаму так адбываецца. Цікава было разбірацца, як утвараюцца міражы, асабліва Фата Маргана — адзін з самых класных і рэдкіх.

У акаўнце «Фізіка для ўсіх» аспірант таксама рэкамендуе кнігі, прапануе ўгадаць формулы. А ў будучыні ён плануе здымаць і відэаролікі.

Чаму школьнікі лічаць фізіку самым складаным прадметам, Павел шчыра не разумее.

— Магчыма, яна падаецца такой, бо матэматыку як след не davучваюць, — разважае ён і дзеліцца сваім бачаннем таго, як варта выкладаць фізіку: — У амерыканскага папулярызатара навукі Рычарда Фэйнмана ёсць такая фраза: калі вы навуковец ці інжынер і не можаце растлумачыць дзіцяці, чым займаецеся, у двух словах, то вы шарлатан. Проста расказваць — гэта сумна і нецікава. Лепш даваць як мага больш малюнкаў і прыводзіць прыклады з жыцця. Вы вось ведалі, што вы — зорка? І ўсе людзі таксама? Калі толькі з'явіўся сусвет, ён складаўся з вадароду і гелію, самых лёгкіх элементаў. Потым яны сталі пераўтварацца ў зоркі. А наша планета ўзнікла на месцы адной з іх.

І яшчэ адна важная заўвага ад Паўла: каб добра выкладаць фізіку, трэба яе любіць.

На думку хлопца, тут, як і ў любым іншым прадмеце, важна зразумець, што і чаму адбываецца, а не проста завучыць на памяць канстанты. «Нехта з навукоўцаў нават казаў: «Калі б я ведаў усе гэтыя лічбы, я быў бы звычайным батанікам».

Чым гэтыя веды дапамагаюць у жыцці? З самага простага — калі ў тэлефона зламаецца падзарадка, фізікі ніколі не панясуць яе ў рамонт: разбяруць, дзе трэба прыпаяюць — і гатова. Па словах аспіранта, звычайна такія прыборы рамантаваць лёгка.

— Глядзелі серыял «Тэорыя вялікага выбуху»? Вось як там паказалі навукоўцаў, насамрэч так і ёсць. Але фізікі — нармальныя! *(Смяецца.)* Проста іх інтарэсы крыху ссунутыя ў іншую сферу. Гэта не значыць, што мы больш нічым не цікавімся. Я, напрыклад, не магу ўявіць свайго жыцця без спорту. Займаўся і хакеем, і футболам, цяпер на бокс хаджу. А вось танцы мне не вельмі паддаюцца. Неяк запрасілі ўдзельнічаць у балі БДУ, і трэба было трэніравацца вальсаваць — гэта было вельмі цяжка! Хоць, магчыма, мне не хапіла цярпення.

Праз год Павел заканчвае аспірантуру. Куды накіруецца далей, пакуль не вызначыўся. Ёсць варыянт пайсці ў праграмаванне, але гэта работа хлопцу не вельмі цікавая. Зусім іншая справа — займацца распрацоўкай «начынкі» для навуковых установак. А вось даследаванні па фізіцы, хутчэй за ўсё, застануцца ў якасці хобі.

**Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ.**

*Карысны досвед*

# ЧАС ІКС,

## або Дапамога ў выбары прафесіі

**Летам многія школьнікі мараць зарабіць на кішэнныя расходы. Кожны выбірае свой шлях: парнікі, збіранне ягад і грыбоў, высаджванне дрэў, расклейванне аб'яў... А ў камунальным жыллёвым унітарным прадпрыемстве «Акцябрскае», што ў аднайменным пасёлку на Гомельшчыне, старшакласнікі маюць магчымасць атрымаць як вопыт, так і грошы вельмі цікавым шляхам: працуючы над інфармацыйна-картаграфічнай сістэмай камунікацый (ІКС) раёна. Такім чынам яны прымяняюць свае веды інфарматызацыі і праектавання на практыцы ў складзе студатрада, створанага пры мясцовым райкаме БРСМ. Аб тым, што сабой уяўляе гэты занятак, як з'явілася ідэя наконт інавацыйнага студэнцкага атрада і што за навыкі можна атрымаць падчас творча-інтэлектуальнай працы, расказвае начальнік вытворчасці па кацельнях і цеплавых сетках, інжынер-праграміст, ініцыятар праекта па распрацоўцы ІКС Аляксандр ФУРС.**



— ІКС, калі гаварыць простай мовай, гэта перавод ранейшых картаў-схем водаправодных і цеплавых сетак, выкананых на паперы, у электронную форму, што дазваляе значна спрасціць іх пошук, фарміраваць справаздачы ўпаўнаважанаму супрацоўніку нават з мабільнага тэлефона або планшэта. Стварэнне ІКС — неабходная ўмова, каб якасна выбудаваць улік і кантроль за эксплуатацыяй і планаваннем развіцця аб'ектаў і сетак прадпрыемстваў (не толькі камунальных), аператыўна прымаць рашэнні падчас надзвычайных сітуацый (разрываў на сетках), — кажа суразмоўнік.

Усё пачалося з таго, што сёлета ў лютым у якасці эксперымента набралі групу дзяцей. Хутка зразумелі, што не памыліліся, калі ўбачылі зацікаўленасць вучняў. Яны часта прасіліся застацца яшчэ на пару гадзін або прыйсці папрацаваць на выхадных.

Таму пры стварэнні студатрадаў на лета райкам БРСМ распаўсюдзіў інфармацыю пра магчымасць такога працаўладкавання. На прадпрыемстве было накіравана 17 вучняў ва ўзросце ад 14 гадоў. У асноўным прыйшлі хлапчукі. Яны афіцыйна працаўладкаваны і напрыканцы атрымаюць свае грашовыя бонусы.

Работа вядзецца толькі над рэальнымі аб'ектамі, якія ідуць у прамысловую эксплуатацыю. Канчатковы вынік чакаецца праз два гады.

— Мы нікога з падлеткаў не затрымліваем, — дадае Аляксандр Фурс, — бо павінен быць выбар, трэба самому прабіваць дарогу і браць ад жыцця неабходнае.

Колькасць школьнікаў, ахвотных прайсці праз камунальны навучальны клас, дазволіла выбудаваць сістэму рэйтынга для кадравага адбору: на кожнага заводзяцца асабістыя справы, у якіх пазначаецца здольнасці і схільнасці падлеткаў у працы. На лета з Акцябрскім райкамам БРСМ было заключана пагадненне аб працаўладкаванні школьнікаў мясцовых школ і навучэнцаў сельскагаспадарчага ліцэя ў складзе трох студатрадаў. Пасля выпуску навучэнцы атрымаюць дадатковае пасведчанне «Спецыяліст па стварэнні ІКС у камунальнай сферы». Гэта дасць ім магчымасць пайсці на адно з прадпрыемстваў камунальнага сектара па гэтым кірунку са стартавай аплатай працы, эквівалентнай 200—250 доларам.

На падставе распачатага кіраўніцтвам прадпрыемства эксперымента навучанне было вырашана падоўжыць на ўвесь год. У праграму таксама ўвойдуць экскурсіі на прадпрыемствы камунальнай галіны, наведванне выставак і канферэнцый, удзел у перамовах. Пагадзіцеся — цікава!

Безумоўна, практычнае прыкладное праграмаванне — адказная справа для падлеткаў. Але ў гутарцы з Яўгенам Патапенкам, вучнем 9 класа, і Арцёмам Дончанкам, вучнем 10 класа, стаж якіх складае па паўгода, гэтага не адчуваецца. Для іх работа над ІКС не цяжкая, яна ўсяго толькі патрабуе ўважлівасці, акуратнасці, дакладнасці і цярпення. За апошні час студатрадаўцамі, якія шчыруюць у якасці праграмістаў на прадпрыемстве КЖУП «Акцябрскае», было пераведзена больш за 150 картаў-схем з папяровага варыянту ў электронны. Свой працоўны семестр школьнікі завяршаць у канцы жніўня.

**Дар'я ШЛАПАКОВА,**
**студэнтка III курса факультэта журналістыкі БДУ.**

*Адпачыць і зарабіць*

# Хачу ў студатрад! Яшчэ і яшчэ!



**Не толькі «мехмат» ведае, што ўраўненне цудоўнага летняга адпачынку мае некалькі складнікаў: кола найлепшых сяброў, многа-многа марожанага, танцы да світання і... магчымасць праявіць сябе ў прафесійнай сферы. Штаб працоўных спраў БРСМ БДУ добра ведае гэтую «матэматыку» сучаснай моладзі і дае магчымасць кожнаму ахвотнаму не толькі зарабіць, але і найперш знайсці занятак па душы, пазнаёміцца з актыўнымі равеснікамі. На працягу ўсяго лета ад універсітэта працуюць студэнцкія атрады шасці кірункаў: педагагічны, будаўнічы, сельскагаспадарчы, сэрвісны, экалагічны і вытворчы. Пазнаёмімся з некаторымі бліжэй.**

Універсітэцкае вучэбна-доследнае прадпрыемства «Шчомысліца» гарантуе ўсе самыя лепшыя ўмовы для студэнтаў, якія сапраўды жадаюць прыкласці, як той казаў, свае рукі да справы. Адзін з удзельнікаў сельскагаспадарчага атрада Вадзім Карпішук, студэнт І курса факультэта радыёфізікі і камп'ютарных тэхналогій, расказвае пра асаблівасці сваёй працы:



— Асноўнай задачай для нас была праполка дэкаратыўных раслін. Дзённая норма — 50 метраў. Дзяўчаты толькі палолі, а я яшчэ дапамагаў ім, збіраючы пустазелле віламі. Атрад невялікі: працавала дзесяць чалавек. З раніцы аграном выдзяляў нам градкі, а ўвечары — чакаў добрых вынікаў.

Тым, хто з самага дзяцінства кожную раніцу гатаваў манную кашу для малога брацікa або сястрычкі і глядзеў з імі мульцікі, было даспадобы працаваць у якасці педагога. Атрады на базе цэнтра «Расток» і спартыўна-аздараўленчага комплексу «Брыганціна» запрашалі да сябе ўсю зацікаўленую моладзь. Ліяна Шапялевіч, студэнтка ІІ курса філалагічнага факультэта, была ў апошнім удзельніцай сэрвіснага атрада, ад працы там летам атрымала шмат станоўчых эмоцый.

— Нашы намаганні былі скіраваны на якаснае абслугоўванне тых, хто адпачывае ў лагеры. Маглі прыбіраць тэрыторыю, дапамагаць на кухні. Таксама ўбіралі асобныя комплексы: спартыўны, медыцынскі, звычайныя дзіцячыя. Была магчымасць выбіраць, чым займацца, якую тэрыторыю абслугоўваць. У маім атрадзе нас было дзесяць. Працавалі з 8 да 16 гадзін, а далей — вольны час. Давалася тры выхадныя, якія можна было браць у зручны для сябе дзень. Было весела і цікава, былі студатрадаўцы, якія працавалі ўжо не першы раз. Усё спадабалася, і я планую паехаць у «Брыганціну» налета зноў!

Сваімі ўражаннямі дзеліцца і Ганна Гуляй, студэнтка І курса філалагічнага факультэта, якая ў ліпені працавала ў Нацыянальнай кампаніі электрасувязі «Белтэлекам»:

— Я пераканалася, што не памылілася, вырашыўшы пайсці працаваць летам. Цудоўны калектыў з прыемнай атмасферай, добры заробак, які залежаў ад нашых намаганняў, зручны графік — усё гэта вельмі прываблівала. Работа на самай справе была вельмі простая: распаўсюджванне інфармацыі пра пакеты паслуг «Белтэлекама». Налета планую зноў прыняць удзел у рабоце студэнцкіх атрадаў!

Яшчэ адзін сэрвісны атрад «Букіністы» шчыруе ў ААТ «Белкніга». Студэнты розных навучальных установ штогод працуюць на складах гэтага прадпрыемства. Алена Пузанава, студэнтка ІІ курса біялагічнага факультэта, якая трапіла ў студатрад першы раз, расказала пра асаблівасці сваёй работы:

— Я хацела працаваць у краме ААТ «Белкніга», але ніколькі не засмуцілася, калі зразумела, што пайду ў іншае месца. Работа кладаўшчыка простая, але адказная. Я была на складзе канцылярскіх тавараў, там галоўным было ўсё правільна падлічыць.

**Марыя КАСКО,**
**студэнтка І курса філалагічнага факультэта БДУ.**

# ДАХОДНЫЯ КАНІКУЛЫ Ў «НАВУЦЫ»



Улад Апацкі шчыруе на полі.

***(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)***

Прачынацца трэба ледзь не раней, чым у школу. І, добра падсілкаваўшыся, з баявым настроем ісці ў галоўны будынак «Навукі». Там з самага ранку — мітусня, гоман, пытанні: «Калі ўжо паедзем?», «На які ўчастак сёння?» Юныя памочнікі тут чакаюць заданняў. Яны могуць атрымаць іх з розных аддзелаў: селекцыі, насенневодства збожжавых і зернебабовых культур, кормавытворчасці.

Калі кожнаму знаходзіцца занятак, у калідорах становіцца ціха. Усе на палетках, у ангары ці на складзе — там пачынае віраваць працоўнае жыццё.

Бліжэй за ўсё ад «Навукі» да ангара. Туды я і наведалася перш за ўсё. Закрыты з усіх бакоў, ён добра хавае работнікаў і ад спёкі, і ад дажджу — умовы надвор'я для іх не перашкода. У ангары шчыруюць трое: двое «навукоўцаў» і чатырнаццацігадовая Аліна Скуратовіч. Яна чэрпае вядром зерне і перасыпае ў спецыяльны баул. Рухаецца бадзёра, ні на хвіліну не спыняючыся, моўчкі. Без звыклай кампаніі ёй, мабыць, сумна. Астатнія сёння шчыруюць на складзе.

На ім больш шумна, бо працуюць не толькі людзі, але і машыны. Трое падлеткаў — пятнаццацігадовы Артур Ладуцька, шаснаццацігадовая Ганна Тарлоўская і чатырнаццацігадовая Маша Махітка — перасыпаюць насенне з баулаў у мяхі, якія ставяцца на вялікія прамысловыя вагі. Павінна атрымацца роўна 40 кілаграмаў. На маё здзіўленне, чаму яны такія сур'ёзныя, падлеткі кажуць: «Дык і работа ў нас такая, сур'ёзная!» Аднак на пытанне, на што патрацяць грошы, адказваюць бадзёра. Артур — на сябе, Маша — на школьныя прылады, а Ганна на... матацыкл! Пагутарыўшы з імі яшчэ пра тое-сёе, прыгадала свой досвед працы ў «Навуцы», які быў чатыры-пяць гадоў таму. У нас у калектыве заўжды было весела! Спадзеюся, што ў іх таксама пануе сяброўская атмасфера (можа, пакуль не прачнуліся), выправілася далей.

На полі праца найбольш складаная. Летам часта альбо дождж, альбо неймаверная спёка. Гэтым разам туды накіравалі збіраць гарох пятнаццацігадовага Улада Апацкага, які ў «Навуцы» ўжо два месяцы. Ён хутка збіраецца паступаць у мясцовы будаўнічы ліцэй, таму грошы лішнімі не будуць.

...Калі скончацца канікулы, нашы героі, гледзячы на самастойна набытыя пакупкі, будуць успамінаць насычанае працай лета і ганарыцца сабой. За некалькі месяцаў яны сталі больш дарослымі.

**Юлія АДАМОВІЧ,**
**студэнтка III курса факультэта журналістыкі БДУ.**

*Усё — у тваіх руках!*

# СІЛА ВОЛІ, СІЛА ДУХУ

## Як энтузіяст навучае варкаўту ахвотных



**ДНЁМ Арцём ВАЖУЙ працуе выпрабавальнікам на сталічным прадпрыемстве па вытворчасці мікрасхем. А ўвечары на спартыўнай пляцоўцы трэніруе свае цела. І заахвочвае да спорту іншых. Адзін з заснавальнікаў маладзёжнай федэрацыі варкаўта, хлопец пяць разоў на тыдзень праводзіць бясплатныя трэніроўкі для ўсіх ахвотных.**

— Мне многія пішуць: «Я за бясплатна нічога б не рабіў». Але грошы сёння ёсць, а заўтра іх няма. Мне цікава перадаваць веды. Некаторыя прапаноўвалі заплаціць, але калі я вазьму грошы, то затапчу філасофію варкаўта. Трэніроўкі мусяць быць даступнымі для ўсіх, — лічыць Арцём.

Варкаўт насамрэч з'ява не новая. Ён існаваў яшчэ ў СССР, проста яго так не называлі — гэта была звычайная фізкультура. Цяпер тэрмін змянілі, каб прыцягнуць людзей.

— Мы хочам, каб чалавек на трэніроўках знаходзіў сяброў, падтрымку. У нас ужо тры закаханыя пары ўтварыліся, — дзеліцца хлопец.

Мы гутарым з ім у парку імя Марата Казея. Летам на заняткі на вулічную пляцоўку, што знаходзіцца тут, прыходзіць да 30 чалавек. Запрашаюць нават тых, хто не ўмее адціскацца і падцягвацца. Праграму Арцём прыдумвае сам: стварае мікс з розных спартыўных кірункаў, уключае нават практыкаванні, якія ўваходзяць у курс падрыхтоўкі амерыканскіх «марскіх коцікаў» і рэйнджараў. Змест трэніровак заўсёды розны, бо, калі рабіць адно і тое ж, мышцы прывыкаюць і выніку няма.

— Калі хтосьці кажа, што не прыходзіць, бо стамляецца на рабоце, гэта ўсё адгаворкі, — упэўнены хлопец. — Я неяк вырашыў сябе праверыць. Уладкаваўся грузчыкам, працаваў па восем гадзін, а потым ішоў на трэніроўкі. Паказваў, што магчыма займацца спортам нават пасля фізічнай працы.



Складана паверыць, але да 11 класа ўключна Арцёма спорт увогуле не цікавіў. Нават ад урокаў фізкультуры ён быў вызвалены. А яшчэ вельмі саромеўся выступаць перад публікай. Дагэтуль памятае, як калацілася ў яго сэрца, калі трэба было выйсці да дошкі. Неяк на прасторах YouTube ён шукаў матывацыйнае відэа і натыкнуўся на ролік пра Дзяніса Мініна, пачынальніка руху варкаўт ва Украіне. Тады Арцём зразумеў, што трэба прыўносіць у жыццё спорт. А варкаўт выбраў за тое, што ён робіць цела гнуткім і функцыянальным.

Хлопец вывучаў спецыялізаваную літаратуру, перапісваўся з замежнымі трэнерамі, каб пераняць вопыт. Праводзіць трэніроўкі для гараджан на адкрытым паветры вырашыў чатыры гады таму. Праўда, першыя заняткі праходзілі, мякка кажучы, без ажыятажу: збіралася па некалькі чалавек. Здавалася, ідэя праваліцца. Але Арцём не адступіў.

Цяпер трэніроўкі на вуліцы праходзяць і ў снег, і ў дождж. Хлопец заклікае моладзь не толькі займацца спортам, але і адмаўляцца ад шкодных звычак — ужывання алкаголю, курэння, брыдкаслоўя.

Ён, дарэчы, вегетарыянец. «Калі еў мяса, адчуваў цяжкасць падчас заняткаў. Вырашыў правесці эксперымент: перайсці на раслінную ежу. У мяне быў такі прыліў энергіі на трэніроўках! Рабіў заўсёды 50 адцісканняў, а тут змог 100. Але прымушаць чалавека адмаўляцца ад мяса не трэба. Кожны сам выбірае, што яму падыходзіць. Недзе чытаў, што наш арганізм разлічаны на тое, каб пражыць 110 гадоў. Я на столькі і нацэлены: кажуць, што вегетарыянства прадаўжае жыццё», — ці то жартам, ці то ўсур'ёз заўважае Арцём.

**На заметку**

**Трэніроўкі па варкаўце праходзяць у мінскім парку імя Марата Казея па аўторках, чацвяргах, пятніцах (з 18.00) і па суботах — нядзелях (з 16.00). Заняткі доўжацца дзве гадзіны. Раім не спазняцца — інакш давядзецца рабіць штрафныя 20 адцісканняў.**

Пратэінавых дабавак хлопец не ўжывае. Тлумачыць, што, калі ў вас мэта — выступаць на спаборніцтвах па бодзібілдынгу, без іх не абысціся. Але калі займаешся спортам для аздараўлення, «хімія» не патрэбная. І прыводзіць наступны аргумент: «Калі мы прымаем стэроіды, то цела будзе прыгожым і рэльефным, толькі пакуль мы займаемся. Перастанем — хутка пачне «абвісаць». Лепш не напіхваць арганізм дабаўкамі, тады і год, і два пасля спынення трэніровак форма застанецца ранейшай. А карысныя натуральныя кактэйлі можна рабіць самому. Я, напрыклад, перамолваю ў блэндары з малаком семя льну і чыа, ражанку, перапяліныя яйкі, банан, ягады годжы.

На спаборніцтвах варкаўтары паказваюць эфектныя трукі. Але Арцём папярэджвае: не чакайце, што прыступіце да вывучэння складаных гімнастычных элементаў ужо на першых трэніроўках. Навічок год займаецца толькі базавай падрыхтоўкай. Бо ў чалавека яшчэ слабыя рукі, спіна — калі даць яму выканаць «сцяжок» ці стойку, ён сябе не ўтрымае.

Галоўная парада навічкам — верыць у свае сілы. Інструктар раіць не заганяць сябе ў рамкі. «Вы думаеце, што можаце зрабіць максімум 10 адцісканняў, але цела здольнае на куды большую нагрузку».

Займацца на пляцоўку прыходзяць людзі розных прафесій. Быў нават святар. У яго балела спіна, было цяжка стаяць падчас службы. Трэніроўкі на турніках далі эфект — болі ўціхлі. Цяпер гэты святар служыць у ЗША, але кожны кастрычнік, калі прыязджае сюды, ідзе займацца на пляцоўку. Да спорту ў яго асаблівы падыход: паколькі цела — гэта храм душы, важна яго не запускаць і займацца фізічным развіццём.

Летась Арцём разам з аднадумцам Аляксандрам Сергіенкам зарэгістраваў маладзёжнае спартыўнае грамадскае аб'яднанне «Федэрацыя варкаўт», каб людзі, захопленыя гэтым кірункам, маглі сябе развіваць — удзельнічаць у спаборніцтвах, ездзіць у іншыя краіны і знаёміцца з замежнымі атлетамі. Нядаўна хлопцы правялі тур па 30 гарадах Беларусі з паказальнымі выступленнямі. Імкнуцца ахапіць вулічнымі трэніроўкамі не толькі ўсе раёны Мінска, але і іншыя гарады. Ёсць карпусы інструктараў у Брэсце, Гомелі, Віцебску, Салігорску, Стоўбцах. Застаецца знайсці спонсара, бо пакуль федэрацыя існуе на асабістыя грошы яе заснавальнікаў. Арцём адразу прызнаецца: вытворцаў салодкіх газіраваных напояў, фастфуду і іншых прадуктаў, якія ніяк не звязаны са здаровым ладам жыцця, у якасці спонсараў яны не разглядаюць.

— З часам я хацеў бы пакінуць асноўную работу і цалкам пераключыцца на спорт, — дзеліцца планамі хлопец. — Хачу праз варкаўт дапамагаць іншым людзям мяняцца да лепшага.

**Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ.**

*Нябачныя масты*

# «АЛІМПІЯ» — У ПАДТРЫМКУ БУДУЧЫХ ГУЛЬНЯЎ




**«Разам: насустрач II Еўрапейскім гульням — 2019!» Пад такім слоганам 24—26 чэрвеня пад Ракавам на беразе маляўнічай ракі Іслач пройдзе XIV Рэспубліканскі спартыўны фестываль для працоўнай моладзі «Алімпія-2018», ідэйным натхняльнікам якога з 2004 года выступае грамадскае аб'яднанне «Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі».**

Традыцыйна фестываль аб'яднае каманды актывістаў Саюза моладзі з усіх рэгіёнаў Беларусі (у кожнай — ад 30 да 50 удзельнікаў). Усе яны працуюць на буйных прадпрыемствах краіны, а таксама ў міністэрствах, ведамствах і арганізацыях. Пра свой удзел заявілі ўжо 16 спартыўных, творчых і крэатыўных дружын. Сярод пачаткоўцаў — каманда РУП «Белмедпрэпараты», паведамілі ў Цэнтральным камітэце БРСМ.

У гэтым годзе акцэнт фестывалю зроблены на папулярызацыю II Еўрапейскіх гульняў 2019 года. Каманды выступяць у вобразах краін-удзельніц гэтай знакавай спартыўнай падзеі, якую ўжо ў наступным годзе прыме Беларусь.

Напрыклад, згодна з праведзенай жараб'ёўкай, каманда Міністэрства па надзвычайных сітуацыях выступіць на фэсце пад сцягам Азербайджана, Беларуская чыгунка — Арменіі, ААТ «АСБ Беларусбанк» — Партугаліі, ААТ «МАЗ» — кіруючая кампанія холдынга «БелаўтаМАЗ» — Іспаніі, Камітэт дзяржаўнага кантролю Беларусі — Францыі і г. д. Гонар Сінявокай на «Алімпіі» будзе абараняць Дзяржаўны ваенна-прамысловы камітэт.

Традыцыйна фестываль будзе насычаны спартыўнымі спаборніцтвамі і творчымі конкурсамі. Яго ўдзельнікі змогуць прэтэндаваць на перамогу ў намінацыях: «Спорт» (футбол, валейбол, перацягванне каната, дартс, падыманне гіры); «Турызм» (тэхніка пешаходнага турызму, конкурс біваакаў, зробленых у стылі краіны, конкурс прыгатавання нацыянальных страў, сплаў на байдарках); «Творчасць» (конкурс візітных картак камандаў-удзельніц, інтэлектуальны турнір «Плацінавая сава», фестываль-конкурс песні пад гітару «Песні мірных гадоў»). Дыпломам, памятнай статуэткай (кубкам) і каштоўным прызам будзе адзначана каманда — абсалютны пераможца фестывалю, а таксама яго сярэбраны і бронзавы прызёры.

Дадатковым стымулам да перамогі стануць «Алімпікі» — спецыяльныя бонусы, якія штодня змогуць зарабляць каманды за актыўны ўдзел у мерапрыемствах праграмы.

XIV Рэспубліканскі спартыўны фестываль для працоўнай моладзі «Алімпія-2018» адкрые парад краін-удзельніц (24 жніўня ў 16.30). Адно з цэнтральных мерапрыемстваў першага дня — адкрыты дыялог «Насустрач II Еўрапейскім гульням — 2019» (17.30).

Дарэчы, на працягу ўсёй праграмы фестывалю ўладальніца тытулаў «Каралева Вясна Беларусі — 2018», «Першая віцэ-Каралева Вясна — 2018» Міжнароднага міжвузаўскага конкурсу грацыі і артыстычнага майстэрства Марыя Салаўёва арганізуе майстар-класы для ўдзельнікаў па спартыўных бальных танцах. Вынікам гэтай творчай задумкі стане сумесная харэаграфічная замалёўка на цырымоніі закрыцця «Алімпіі».

Нагадаем, што рэспубліканскі спартыўны фестываль для працоўнай моладзі «Алімпія» рэалізуецца пры падтрымцы міністэрстваў адукацыі, спорту і турызму, інфармацыі, Мінскага абласнога выканаўчага камітэта і Беларускай чыгункі.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

## Извещение о проведении 7 сентября 2018 года повторных торгов с условиями по продаже имущества, принадлежащего ОАО «Белметалл»

| Предмет торгов № 1 |
|---|
| открытый склад № 1 (инв. № в ЕГРНИ 110/С-62149, площадь – 8916,3 кв. м); магазин автозапчастей (инв. № в ЕГРНИ 110/С-86092, площадь – 98,8 кв. м); туалет (инв. № в ЕГРНИ 110/С-99800, площадь – 28,6 кв. м); пост охраны (инв. № в ЕГРНИ 110/С-99750, площадь – 7,7 кв. м); торговые павильоны (инв. № в ЕГРНИ 110/С-100114, площадь – 345,8 кв. м) |
| Местонахождение – Брестская обл., г. Барановичи, ул. Слонимское Шоссе, 18В |
| Сведения о земельных участках: участок площадью 2,4570 га с кадастровым номером 141000000001003135; участок площадью 0,0137 га с кадастровым номером 141000000001003136 |
| Начальная цена – 292 280,00 бел. руб. без учета НДС |
| Сумма задатка – 29 200,00 белорусских рублей |
| **Предмет торгов № 2** |
| цех услуг (инв. № в ЕГРНИ 110/С-86090, площадь – 649,6 кв. м); туалет (инв. № в ЕГРНИ 110/С-99715, площадь – 1,5 кв. м) |
| Местонахождение – Брестская обл., г. Барановичи, ул. Слонимское Шоссе, 18Г |
| Площадь земельного участка – 0,4034 га, кадастровый номер 141000000001003133 |
| Начальная цена – 43 972,00 бел. руб. без учета НДС |
| Сумма задатка – 4 300,00 белорусских рублей |
| **Предмет торгов № 3** |
| склад № 3 (инв. № в ЕГРНИ 240/С-29340, площадь – 359 кв. м); здание склада № 5 (инв. № в ЕГРНИ 240/С-27903, площадь – 351,9 кв. м) |
| Местонахождение – г. Орша, ул. Доминиканская, 42 |
| Площадь земельного участка – 0,3257 га, кадастровый номер 223650100001015170 |
| Начальная цена – 23 333,77 бел. руб. без учета НДС |
| Сумма задатка – 2 300,00 белорусских рублей |

**Продавец имущества** – ОАО «БЕЛМЕТАЛЛ», пр. Партизанский, 174, к. 301, 220075, г. Минск.

**Организатор торгов** – государственное предприятие «МГЦН», ул. К. Маркса, 39, к. 10, 220030, г. Минск.

**Условие торгов** – победитель торгов (покупатель) оплачивает вознаграждение за организацию и проведение торгов, включающее затраты на организацию и проведение результативного аукциона, в размере 1 процента от цены продажи предмета торгов, указанной в протоколе о результатах торгов, в течение 3 рабочих дней со дня проведения торгов.

Торги проводятся в соответствии со ст. ст. 417, 418 Гражданского кодекса Республики Беларусь и порядком проведения аукциона по продаже имущества ОАО «БЕЛМЕТАЛЛ», утвержденным организатором торгов.

К участию в торгах допускаются юридические и физические лица, внесшие задаток и заключившие соглашение с организатором торгов о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона по соответствующему предмету торгов, а также представившие организатору торгов следующие документы:

заявление на участие в аукционе (по форме, установленной организатором торгов); заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, порядком проведения аукциона (по форме, установленной организатором торгов); копию свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); копию устава (для юридических лиц); копию платежного документа о внесении задатка (задатков); документы, подтверждающие полномочия представителя юридического (физического) лица; а также, при необходимости, иные документы в соответствии с порядком проведения аукциона.

Задаток (задатки) перечисляется на расчетный счет государственного предприятия «МГЦН» № BY34 BPSB 3012 1049 7101 9933 0000 в Региональной дирекции № 700 по г. Минску и Минской области ОАО «БПС-Сбербанк», БИК BPSBBY2X, УНП 190398583 не позднее окончания срока приема документов на участие в торгах.

Торги проходят в форме открытого аукциона с условиями на повышение начальной цены. Торги проводит аукционист, определенный организатором торгов. В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов, а наивысшая цена (цена продажи) фиксируется в протоколе о результатах торгов и не включает НДС. В ходе торгов участники могут предлагать свою цену за продаваемое имущество в соответствии с порядком проведения аукциона.

В случае если торги признаны несостоявшимися в силу того, что заявление на участие в них подано только одним участником или для участия в них явился только один участник, предмет торгов продается этому участнику (покупателю) при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов.

Договор купли-продажи между продавцом и победителем торгов (покупателем) заключается после предъявления копии платежных документов о перечислении суммы вознаграждения за организацию и проведение торгов и подписывается в течение 10 рабочих дней со дня проведения торгов.

Оплата стоимости приобретенного имущества с учетом НДС осуществляется победителем торгов (покупателем) в порядке, предусмотренном в договоре купли-продажи. По согласованию с продавцом возможна рассрочка платежа.

Торги проводятся 7 сентября 2018 года в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов. Прием документов, а также консультации по вопросам участия в торгах осуществляются с 24.08.2018 по 05.09.2018 включительно в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 (по пятницам – до 16.45) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6.

Телефоны для справок:
(017) 327-48-36 (государственное предприятие «МГЦН»);
(017) 344-54-51, (029) 1-295-295 (ОАО «БЕЛМЕТАЛЛ»).

## Отчет о деятельности Фонда «Экологический транспорт»
### (УНП 194902830) за 2015 г.

Количество учредителей – 1 (Один).

Поступление денежных средств для осуществления уставной деятельности – 0 руб.

Иные, не запрещенные законодательством Республики Беларусь, поступления – 0 руб.

Доход, полученный от осуществляемой в соответствии с Уставом деятельности, – 0 руб.

Стоимость имущества фонда на 31.12.2016 г. – 31,77 руб., в т. ч.:

– остаток денежных средств на расчетном счете — 31,77 руб.

Общая сумма расходов, понесенных Фондом для достижения общественно-полезных целей, в соответствии с Уставом Фонда – 0 руб.

Количество унитарных предприятий, хозяйственных обществ, созданных Фондом для осуществления предпринимательской деятельности, в т. ч. участие Фонда в таких юридических лицах – 0 (ноль).

**www.ecotransport.by**

## Отчет о деятельности Фонда «Экологический транспорт»
### (УНП 194902830) за 2017 г.

Количество учредителей – 1 (Один).

Поступление денежных средств для осуществления уставной деятельности – 0 руб.

Иные, не запрещенные законодательством Республики Беларусь, поступления – 0 руб.

Доход, полученный от осуществляемой в соответствии с Уставом деятельности, – 0 руб.

Стоимость имущества фонда на 31.12.2016г. – 31,77 руб., в т. ч.:

– остаток денежных средств на расчетном счете – 31,77 руб.

Общая сумма расходов, понесенных Фондом для достижения общественно-полезных целей, в соответствии с Уставом Фонда – 0 руб.

Количество унитарных предприятий, хозяйственных обществ, созданных Фондом для осуществления предпринимательской деятельности, в т. ч. участие Фонда в таких юридических лицах – 0 (ноль).

**www.ecotransport.by**

## Извещение о проведении 25 сентября 2018 года аукционных торгов по продаже изолированного помещения, находящегося в собственности Несвижского района

| | |
|---|---|
| **Предмет торгов (сведения о продаваемом имуществе, инв. номер в ЕГРНИ)** | Изолированное помещение (торговое помещение) с инвентарным номером 621/D-21452. Общая площадь – 125,3 кв. м. Назначение – торговое помещение. Год постройки – 1985. Торговое помещение расположено на первом этаже здания. Наружные и внутренние стены – кирпичные, перегородки – кирпичные, полные с проемами. Полы – плиточные, линолеум. Проемы оконные – двойные, деревянные. Проемы дверные – деревянные, входные металлические. Перекрытия – железобетонное. Внутренняя отделка – оштукатурено, окрашено, в санузлах – облицовка плиткой. Отопление – центральное. Канализация – центральная. Водопровод – стальные трубы с подключением к уличной сети. Горячее водоснабжение – нет. Электроснабжение – скрытая проводка. Вентиляция – естественная |
| **Местонахождение имущества** | Минская обл., Несвижский р-н, г. п. Городея, ул. Вокзальная, 23А-19 |
| **Продавец имущества** | Районное унитарное предприятие «Несвижское ЖКХ», ул. Шимко, 74А, 222603, г. Несвиж, Минская область |
| **Организатор торгов** | Государственное предприятие «МГЦН», ул. К. Маркса, 39, к. 10, 220030, г. Минск |
| **Начальная цена предмета торгов (без учета НДС)** | 32 886,64 бел. руб. |
| **Сумма задатка** | 3 200,00 бел. руб. |
| **Необходимые условия** | Заключить договор купли-продажи имущества на условиях, определенных Несвижским районным исполнительным комитетом:<br>– в двухмесячный срок после подписания договора купли-продажи осуществить государственную регистрацию права на имущество;<br>– в течение одного месяца с даты государственной регистрации перехода права собственности обратиться в Несвижский районный исполнительный комитет для получения разрешения на разработку проектно-сметной документации, проведение проектно-изыскательских работ (в случае необходимости ее разработки) либо информировать Несвижский райисполком в указанный срок об отсутствии такой необходимости;<br>– в срок не позднее 6 месяцев с момента получения разрешения, если иное не предусмотрено законодательством, разработать проектно-сметную документацию, провести проектно-изыскательские работы;<br>– провести реконструкцию (строительство) имущества в сроки, предусмотренные проектно-сметной документацией, с окончанием строительства не позднее 2 лет с даты государственной регистрации перехода права собственности на имущество, если иное не установлено решением Несвижского райисполкома;<br>– запрет на отчуждение имущества до его ввода в эксплуатацию покупателем |

Торги проходят в форме открытого аукциона на повышение начальной цены.

Аукцион проводится в порядке, предусмотренном Положением о порядке организации и проведения аукционов (конкурсов) по продаже отдельных объектов, находящихся в государственной собственности, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 12.07.2013 № 609 (далее – Положение) и с учетом требований Гражданского кодекса Республики Беларусь, а также иных нормативных правовых актов Республики Беларусь, регулирующих вопросы организации и проведения торгов.

Организатор торгов вправе отказаться от их проведения в любое время, но не позднее чем за три дня до наступления даты проведения аукциона.

К участию в торгах допускаются юридические и физические лица, в том числе индивидуальные предприниматели, заключившие соглашение с организатором торгов о правах, обязанностях и ответственности сторон в процессе подготовки и проведения торгов (утвержденной формы), внесшие задаток по соответствующему предмету торгов, подавшие организатору торгов заявление на участие в аукционе (утвержденной формы), к которому прилагаются:

– документ, подтверждающий внесение суммы задатка с отметкой банка;

– юридическим лицом или индивидуальным предпринимателем Республики Беларусь – копия документа, подтверждающего государственную регистрацию;

– иностранным юридическим лицом – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны учреждения (выписка должна быть произведена не ранее шести месяцев до подачи заявления на участие в торгах) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны учреждения с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык;

– иностранным индивидуальным предпринимателем – легализованный в установленном порядке документ, подтверждающий статус, с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык;

– представителем юридического лица Республики Беларусь – доверенность, выданная в установленном законодательством порядке (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель);

– представителем гражданина или индивидуального предпринимателя Республики Беларусь – нотариально удостоверенная доверенность;

– представителем иностранного юридического лица, иностранного физического лица или индивидуального предпринимателя – доверенность, легализованная в установленном законодательством порядке, с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык.

При подаче документов заявитель (его представитель) предъявляет документ, удостоверяющий личность, а руководитель юридического лица – также документ, подтверждающий его полномочия.

Задаток перечисляется на расчетный счет государственного предприятия «МГЦН» № BY34 BPSB 3012 1049 7101 9933 0000 в Региональной дирекции № 700 по г. Минску и Минской области ОАО «БПС-Сбербанк», БИК BPSBBY2X, УНП 190398583, в срок, установленный для приема документов на участие в торгах (назначение платежа – задаток для участия в торгах от 25.09.2018).

Торги проводит аукционист, определяемый организатором торгов. В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов. В ходе торгов участники могут предлагать свою цену за продаваемое имущество в соответствии с Положением.

Затраты на организацию и проведение торгов возмещает победитель торгов (единственный участник торгов) в течение 3 (трех) рабочих дней со дня их проведения. Информация о затратах, порядке и сроках их возмещения доводится до сведения участников перед началом торгов при заключительной регистрации под подпись.

Договор купли-продажи между продавцом и победителем торгов (единственным участником торгов) заключается в течение 10 рабочих дней со дня проведения торгов после предъявления копии платежных документов о перечислении суммы затрат на организацию и проведение торгов.

Оплата стоимости приобретенного имущества осуществляется в течение 30 рабочих дней со дня заключения договора купли-продажи.

Торги проводятся 25 сентября 2018 года в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов. Прием документов на участие в аукционе, а также консультации по вопросам участия в торгах осуществляются с 27.08.2018 по 21.09.2018 включительно в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 (по пятницам – до 16.45) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6.

Телефоны для справок: (017) 327-40-22, 327-48-36 (государственное предприятие «МГЦН»); (01770) 2-32-04 (УП «Несвижское ЖКХ»)

**В связи с утерей считать недействительной** круглую печать с реквизитами: Общество с ограниченной ответственностью «Хаппи фрут», Республика Беларусь, г. Минск, УНП 192925670. Нашедшему обратиться по тел. +375 29 1442334.

## ООО «БелИнвестОценка»извещает о проведении открытого аукциона ПО ПРОДАЖЕ ОБЪЕКТОВ Общества с ограниченной ответственностью «Динамо Програм Текстиль»

**Лот № 1**:

*Объекты недвижимости:*

расположенные по адресу: Брестская область, город Пинск, улица Федотова, дом 9*:*

Капитальное строение (здание кирпичное административно-бытовой корпус вязального цеха) с инв. № 130/С-30542, общей площадью 1015,0 кв. м, год постройки 1987; Капитальное строение (кирпичное здание административно-бытовой корпус красильного цеха) с инв. № 130/С-30543, общей площадью 737,0 кв. м, год постройки 1979; Капитальное строение (кирпичное здание производственного корпуса красильного цеха с кирпичной холодной пристройкой) с инв. № 130/С-30544, общей площадью 3461,0 кв. м, год постройки 1979; Капитальное строение (панельное здание производственного корпуса вязального цеха) с инв. № 130/С-30545, общей площадью 4325,0 кв. м, год постройки 1987; Капитальное строение (кирпичное здание зарядной станции с автогаражом) с инв. № 130/С-30546, общей площадью 281,0 кв. м, год постройки 1987; Капитальное строение (кирпичное здание материального склада) с инв. № 130/С-30547, общей площадью 425,0 кв. м, год постройки 1980; Капитальное строение (одноэтажное кирпичное здание КНС с кирпичной пристройкой) с инв. № 130/С-30549, общей площадью 25,0 кв. м год постройки 1979; Капитальное строение (одноэтажное кирпичное здание водопроводной насосной станции) с инв. № 130/С-30550, общей площадью 132,0 кв. м, год постройки 1979; Капитальное строение (профнастиловое здание алюминиевого склада) с инв. № 130/С-30556, общей площадью 326,0 кв. м, год постройки 1984;

расположенные по адресу: Брестская область, город Пинск, улица Федотова, дом 9А:

*Капитальное сооружение Котельная с инв. № 130/С – 48245, общей площадью 64,8 кв. м, год постройки 2013 .*

*Оборудование:*

Машина кругловязальная ORIZIO JONH/C; инв. № Л-008, предназначена для вязания полотна, год изготовления 2000; Машина кругловязальная ORIZIO JONH/C; инв. № Л-009, предназначена для вязания полотна, год изготовления 2000; Машина кругловязальная ORIZIO JONH/C; инв. № Л-010, предназначена для вязания полотна, год изготовления 2000; Машина кругловязальная ORIZIO CMOAN; инв. № Л-012, предназначена для вязания полотна, год изготовления 2000; Машина кругловязальная ORIZIO JONH/C; инв. № Л-011, предназначена для вязания полотна, год изготовления 2000; Машина кругловязальная ORIZIO CMO4A; инв. № 43-014, предназначена для вязания полотна, год изготовления 1994; Машина кругловязальная ORIZIO FIHN/C; инв. № 43-017, предназначена для вязания полотна, год изготовления 1997; Машина кругловязальная ORIZIO FIHNAN; инв. № 43-012, предназначена для вязания полотна, год изготовления 1995; Машина кругловязальная ORIZIO JOHNAN; инв. № 43-016, предназначена для вязания полотна, год изготовления 1996; Машина кругловязальная ORIZIO CMOAN; инв. № 43-018, предназначена для вязания полотна, год изготовления 2001; Машина кругловязальная ORIZIO JSVRN; инв. № 43-024, предназначена для вязания полотна, год изготовления 1997; Машина кругловязальная ORIZIO JONH/C; инв. № 43-009 предназначена для вязания полотна, год изготовления 2001; Машина кругловязальная ORIZIO FIHNA; инв. № 43-006, предназначена для вязания полотна, год изготовления 2001 (капитальный ремонт); Машина кругловязальная ORIZIO JSVRN; инв. № 43-026, предназначена для вязания полотна, год изготовления 1998 (капитальный ремонт); Машина кругловязальная ORIZIO JONH/C; инв. № 43-021, предназначена для вязания полотна, год изготовления 1997; Машина плосковязальная PROTTI,PT 222, инв. № 43-010, предназначена для вязания полотна, год изготовления 2004; Машина ворсовальная PEGASO*6, инв. № 44-027, предназначена для ворсования полотна, год изготовления 2000; Машина ворсовальная PEGASO*6 COMET, инв. № 44-018, предназначена для ворсования полотна, год изготовления 2000; Машина ворсовальная GRI-124H2200MM, инв. № 44-092, предназначена для ворсования полотна, год изготовления 2009; Машина стригальная ORION/2001 COMET, инв. № 44-019, предназначена для стрижки полотна, год изготовления 2000; Машина стригальная CMI-IH2200MM, инв. № 44-093, предназначена для стрижки полотна, год изготовления 2000.

Начальная цена продажи. 1 626 796,87 (один миллион шестьсот двадцать шесть тысяч семьсот девяносто шесть рублей 87 копеек) белорусских рублей с учетом налога на добавленную стоимость по ставке 20 %. Задаток для участия в аукционе составляет 5 %, или 81 339,85 (восемьдесят одна тысяча триста тридцать девять рублей 85 копеек) белорусского рубля.

Объекты расположены на земельных участках: площадью 0,3964 га по адресу: Республика Беларусь, Брестская область, г. Пинск, ул. Федорова, 9А и 1,4846 га по адресу: Республика Беларусь, Брестская область, г. Пинск, ул. Федорова, 9.

Аукцион состоится в 14.00 27.09.2018 по адресу: **г. Минск, ул. Казинца, 62, актовый зал.**

Продавец – ООО «Динамо Програм Текстиль», 225710, г. Пинск, ул. Ленина, 20.

Организатор аукциона – ООО «БелИнвестОценка», 220108, г. Минск, ул. Казинца, 62, пом. 910.

